

ІНДЫЙСКІЯ ТАНЦЫ — У 70 ГАДОЎ 9

ТАЙНЫ ЛЮБЧАНСКАГА ЗАМКА 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 ЛЮТАГА 2021 г. АЎТОРАК № 34 (29403)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ХМЕЛЬ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

*«У цэлым плацежная дысцыпліна грамадзян нашай краіны на высокім узроўні, сур'ёзных праблем па неаплаце жыллёва-камунальных паслуг насельніцтвам не маем. Усяго ў краіне 4 млн 200 асабовых рахункаў. Калі ў кастрычніку—снежні 2020 года колькасць пратэрмінаваных асабовых рахункаў даходзіла да 470—490 тысяч, то на 1 студзеня гэтага года іх крыху больш за 400 тысяч. Але гэта не гаворыць пра тое, што 400 тысяч асабовых рахункаў — злосныя неплацельшчыкі. 70 % з іх маюць запазычанасць не больш за тры месяцы. Да таго ж, у спіс даўжнікоў трапляюць нават тыя, хто памылкова недаплаціў адзін-два рублі».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «План дзеянняў ёсць»

## Прэзідэнты Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін правялі перагаворы ў Сочы



Фота БелТА.

**Лідары Беларусі і Расіі абмеркавалі пытанні развіцця беларуска-расійскіх адносін, сумеснае рэагаванне на выклікі, у тым ліку ў сферы ваеннай бяспекі, узаемадзеянне ў інтэграцыйных структурах.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цяпер рэдкасць, калі кіраўнікі дзяржаў сустракаюцца сам-насам. «Думаю, што мы працягнем такі фармат зносін. Сур'ёзныя перамовы ў звычайнай вопратцы (маецца на ўвазе нефармальны характар перагавораў. — **«Зв.»**) — гэта сведчыць пра тое, што мы проста блізкія людзі, у нас вельмі блізкія народы і краіны. І мы цалкам можам у любой форме абмяркоўваць нашы сур'ёзныя праблемы», — перадае словы Аляксандра Лукашэнкі БелТА.

На яго думку, бакі нямала зрабілі, праведзена работа на ўзроўні ўрадаў.

«Сапраўды, урады вельмі шмат зрабілі. І Расіі, і Беларусі. Яны абнавілі фармат. Мне сёння пасол Сямашка дакладваў, што там, можа быць, засталося 6-7 дарожных картаў (яны цяпер ужо па-новаму называюцца, іх рэбрэндынг правялі), над якімі нашы ўрады працуюць. Усе астатнія ў прынцыпе гатовыя да падпісання. Таму план дзеянняў ёсць», — заявіў кіраўнік нашай краіны.

СТАР. 2

# НАДЗЕЙНЫ ШЧЫТ ДЗЯРЖАВЫ

***Паважаныя суайчыннікі!***

***Дарагія ветэраны!***

***Таварышы салдаты, сяржанты, прапаршчыкі і афіцэры!***

*Віншую вас з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Гэта сапраўды ўсенароднае свята, якое аб'ядноўвае многія пакаленні беларусаў у самаададным служэнні Радзіме.*

*У краіне створана прафесійная, добра аснашчаная мабільная армія, здольная спыніць любога агрэсара. Яна — надзейны шчыт дзяржавы, вырашальны фактар забеспячэння яе бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці.*

*Кожны год у Беларусі ў армейскі строй становяцца тысячы маладых людзей, сапраўдных патрыётаў, якія верныя прысязе, шануюць перамножныя традыцыі ветэранаў і памяць загінулых за свабоду народа. Няхай доблесць і адвага герояў Вялікай Айчыннай вайны, мужнасць і стойкасць воінаў-інтэрнацыяналістаў служаць прыкладам для ўсіх, хто сёння з гонарам выконвае свой воінскі абавязак.*

*Жадаю вам моцнага здароўя, дабра і міру.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

## КОРАТКА

• Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху пройдзе 26 лютага.

• **«Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў у Тэль-Авіў да 6 сакавіка.**

• Мінская ЦЭЦ-4 правядзе выпрабаванні катлаагрэгата на мазуце.

• **БелАЗ прыступіў да абкаткі чацвёртага 240-тоннага самазвала ў Курскай вобласці.**

• Беларускай шкляной кампаніі перададуць акцыі чатырох заводаў.

• **Памерла актрыса Кацярына Градава, вядомая па ролі радысткі Кэт.**



АПК

# НА ЛІНЕЙЦЫ ГАТОЎНАСЦІ

**Сельгаспрадпрыемствы Гомельшчыны зараз актыўна рыхтуюцца да сяўбы. Рабочы працэс на мехдварах і рамонтных зонах кіпеў у гаспадарках нават у глыбокі «мінус». Прывесці машынна-трактарны парк і пасяўныя агрэгаты ў поўную гатоўнасць да 1 сакавіка — такая задача стаіць перад аграрыямі рэгіёна.**

КСУП «Урыцкае», што на тэрыторыі Гомельскага раёна, — адна з найбуйнейшых гаспадарак у вобласці па вытворчасці, перапрацоўцы і рэалізацыі сельгаспрадукцыі. Позняй восенню, калі скончылі апошнія палявыя работы, усе сельгасагрэгаты тут паставілі на захоўванне, а ў студзені ўжо пачалі падрыхтоўку да пасяўной. Аб'ём работ



Фота Марыны ВАСІЛЬЕВАЙ.

**Трактарыст-машыніст КСУП «Урыцкае» Дзмітрый ЧАЧУХА.**

значны — адрамантаваць глебаапрацоўчыя і пасяўныя агрэгаты, сеялкі, плугі, дыскатары, культыватары. Для рамонту машынна-трактарнага парка набылі ўсе неабходныя запчасткі і дэталі. Сёння сельгаспрадпрыемства рыхтуе тэхніку да тэхагляду.

— Машынна-трактарны парк нашай гаспадаркі — гэта звыш 120 адзінак тэхнікі. У тым ліку шэсць энерганасычаных трактароў, якія поўнасцю гатовы да работы, — уводзіць у курс справы **загадчык рамонтнай майстэрні КСУП «Урыцкае», малады спецыяліст Ілья ГЕРАСІМЕНКА.** — Зараз працягваем наладку глебаапрацоўчых агрэгатаў і плугоў, рыхтуем машыны і трактары да тэхагляду. Спадзяёмся, што пройдзем яго хутка і без затрымкі.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

# «План дзеянняў ёсць»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць Уладзіміру Пуціну за дапамогу эканоміцы рэспублікі. «Я, вядома, вельмі ўдзячны вам за тую падтрымку, якую вы аказваеце эканоміцы Беларусі. Павінен вас праінфармаваць, што гэта нездарма, грошы не выкінутыя на вецер».

Прэзідэнт Беларусі паведаміў аб зніжэнні ўзроўню захваральнасці на ковід у Беларусі і выказаў надзею, што вакцына ўласнай распрацоўкі з'явіцца ў краіне да восені. «Вось гэтая тэма каранавіруса і ваша дасягненне... Я заўсёды кажу і наша трошкі таксама там ёсць з савецкіх часоў. Вытворчасць вакцын — у васужо тры зарэгістраваныя вакцыны і яшчэ ў распрацоўцы, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы таксама ідзём гэтым шляхам. Мы да восені атрымаем сваю вакцыну, і спецыялісты ў нас ёсць».

Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў словы падзякі за супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, у прыватнасці, навучанне студэнтаў з Беларусі ў расійскіх ВНУ. «Хоць у нас прыстойны ўзровень адукацыі, але рабяты актыўна выкарыстоўваюць ВНУ Расійскай Федэрацыі, каб атрымаць добрую адукацыю», — сказаў ён.

Прэзідэнт Беларусі растлумачыў, што поўны ўвод у строй Беларускай АЭС дазволіць сэканоміць прыкладна 5 млрд куб. м прыроднага газу. Тым не менш патрэба ў гэтай сыравіне ў цэлым не знізіцца з улікам планаў па будаўніцтве новага азотнага камбіната ў Гродне. «Таму мы ўсё роўна будзем спажываць прыродны газ ва ўзрастаючых аб'ёмах. Праект коштам 1,2-1,3 млрд, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Новы камбінат. Вопыт у нас ёсць. Таму мы хочам павялічыць аб'ёмы азотных угнаенняў. Калі будзе ваша даручэнне прапрацаваць пытанне, мы з «Газпрамам» гатовыя гэты праект рэалізаваць».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў свайму расійскаму калегу за адкрыццё чыгуначнага руху паміж дзвюма краінамі. «Думаю, недалёкі той момант, калі мы і аўтамабільны рух адкрыем. У нас праблем няма. Мы не зачыненыя тут», — сказаў кіраўнік краіны.

Ён адзначыў, што Расія накіроўвала ў Беларусь спецыялістаў, якія пераканаліся ў тым, што краіны знаходзяцца на прыкладна аднолькавым узроўні па захваральнасці. «На шчасце, цяпер рэзка пачала зніжацца захваральнасць. Дай бог, да восені або можа да лета мы ўжо выйдзем бліжэй да нуля», — дадаў Прэзідэнт Беларусі.

Інструменты ўзаемадзеяння, якія існуюць паміж Расіяй і Беларуссю, адладжаны і працуюць добра, падкрэсліў Прэзідэнт Расіі на пачатку сустрэчы: «Нашы інструменты ўзаемадзеяння добра адладжаны, працуюць добра. У нас няма ні аднаго дня, каб нашы калегі не размаўлялі адзін з адным, вырашаючы тыя ці іншыя пытанні, якія стаяць перад намі».

Уладзімір Пуцін таксама адзначыў, што Расія з'яўляецца самым буйным інвестарам для эканомікі Беларусі: расійскія інвестыцыі складаюць больш як $4 млрд. Па словах расійскага лідара, аб'ём гуманітарных сувязяў паміж краінамі застаецца на вельмі высокім узроўні. «Тут нават пералічваць не трэба, мы вельмі блізкія людзі, блізкія народы: культура, мова, рэлігія, гісторыя сумесныя, прычым заснаваныя не толькі на гераічным адносна нядаўнім мінулым Вялікай Айчыннай вайны, але і якія сыходзяць сваімі каранямі ў стагоддзі», — падкрэсліў кіраўнік расійскай дзяржавы.

Уладзімір Пуцін аддаў увагу ўзаемадзеянню на рэгіянальным узроўні, нагадаўшы, што кожны год праводзяцца сустрэчы паміж кіраўнікамі рэгіянальных кіраўніцкіх структур.

«Гэта вельмі важная работа, таму што на ўзроўні рэгіянальнага ўзаемадзеяння значны аб'ём нашых адносін складваецца», — адзначыў ён.

Прэзідэнт Расіі падкрэсліў, што галоўнае — гэта сумесная работа па кааперацыі ў рэальным сектары эканомікі. Уладзімір Пуцін нагадаў, што двухбаковы тавараабарот за перыяд пандэміі трохі знізіўся — дзесьці на 15 %, але ўсё роўна склаў $28,5 млрд.

Пасля размовы Прэзідэнты Беларусі і Расіі разам пакаталіся на лыжах, паабедалі. Аляксандр Лукашэнка ў падарунак расійскаму калегу прывёз кошык з беларускімі прадуктамі, сярод якіх, апроч нашых традыцыйных прысмакаў, былі хамон і пармезан, зробленыя ў Беларусі.

Народны сход: вынікі і высновы

# «Хочацца, каб Краснаполле актыўна развівалася»

**З такім асабістым пасылам вярнуўся ў родны горад з Усебеларускага народнага сходу намеснік начальніка Краснапольскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні, дэпутат райсавета Аляксандр ШАХОВІЧ.**



Фота з сайта redflag.by.

**Аляксандр ШАХОВІЧ (*крайні злева*).**

Усё яго жыццё звязана з малой радзімай. На жаль, той краснапольскай вёсачкі з пяшчотнай назвай Завадок, дзе нарадзіўся Аляксандр, ужо няма, яе сцёр з карты раёна Чарнобыль. А гэта вельмі балюча для сэрца. Таму тэма малой радзімы для яго вельмі актуальная. Ён перажывае за будучыню Краснаполля, за тое, што моладзь з'язджае адсюль у пошуках лепшага жыцця. І тое, што ў праграме акцэнт робіцца на развіццё малых населеных пунктаў, яго натхняе.

— Для мяне было важна пачуць з першых вуснаў, што чакае рэгіёны, такія населеныя пункты, як наш гарадскі пасёлак Краснаполле, — кажа Аляксандр Шаховіч. — Нельга дапусціць, каб наш раён знік як нейкая адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка. Работа селяніна заўсёды мала цанілася, але карысць ад яе самая вялікая. Я за развіццё малых гарадоў, за тое, каб тут заставаліся маладыя спецыялісты. Мяне турбуе будаўніцтва жылля для моладзі, у тым ліку арэнднага, службовага. Хачу, каб тут ствараліся прадпрыемствы, хай маленькія, але ж здольныя забяспечыць наша насельніцтва работай. Ад людзей, якія прыходзяць да мяне як дэпутата, я таксама чую гэтыя пажаданні. Не ўсе рвуцца з Краснаполля, многіх прымушаюць выязджаць менавіта абставіны. Асабіста я пасля заканчэння юрыдычнага тэхнікума і службы ў арміі мэтанакіравана вярнуўся на сваю радзіму. І з 2002 года працую ратавальнікам. Пачынаў з рабочай спецыяльнасці, потым скончыў універсітэт і стаў намеснікам начальніка. У раёне кадры наогул вельмі цэняць, тут хутчэй можна зрабіць кар'еру і рэалізавацца. Дзяржавай шмат чаго зроблена нават для нашага маленькага Краснаполля. У нас пабудаваны шыкоўны фізкультурна-аздараўленчы комплекс з залай для гульнявых відаў спорту, басейнам і элементамі дзіцячага аквапарку, адкрыўся футбольны стадыён са штучным пакрыццём, у нас ёсць музей, Цэнтр культуры. Месцаў для адпачынку шмат, не хапае высокатэхналагічных рабочых месцаў. Мы чакаем інвестараў, каб у нашых людзей не было жадання працаваць на тых жа суседзяў. Мы ў 30 кіламетрах ад Расіі і жыхары раёна, часцей за ўсё моладзь, з'язджаюць туды працаваць. Трэба неяк выпраўляць такое становішча. На сходзе я пераканаўся, што ўрад краіны таксама заклапочаны гэтым. Мне вельмі спадабалася прамова Прэзідэнта. Яму неабыякавы лёс краіны і яе народа. Гэта прагучала вельмі шчыра. Згодны з тым, што моладзь цяпер вельмі адарваная ад жыцця, яе думкамі і дзеяннямі вельмі часта кіруе інтэрнэт, а аналізаваць інфармацыю яна не ўмее. Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на чарговую пяцігодку, якую зацвердзілі, вельмі грунтоўная, накіраваная на тое, каб краіна стабільна развівалася, а жыццё грамадзян паляпшалася. Цудаў чакаць не трэба, мы павінны самі ствараць для сябе належныя ўмовы. Праграма — гэта найперш кіраўніцтва для дзеяння ўсім нам, першарадныя задачы, якія неабходна выканаць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэзідэнт Алжыра падпісаў указ аб роспуску ніжняй палаты парламента



Прэзідэнт Алжыра Абдэльмаджыд Тэбун падпісаў указ аб роспуску Нацыянальнага народнага сходу (ННС, ніжняя палата парламента краіны). Пра гэта паведаміла інфармацыйнае агенцтва Algeria Press Service. Па словах Тэбуна, ён прыняў рашэнне распусціць ННС, каб абвясціць выбары і тым самым «расчысціць дзверы для моладзі». «Моладзь павінна інтэграваца ў палітычныя інстытуты, і мы дапаможам ёй, узяўшы на сябе большую частку выдаткаў выбарчай кампаніі», — сказаў прэзідэнт. Згодна з законам, выбары ў парламент павінны быць праведзены на працягу максімум трох месяцаў. Тэбун таксама анансаваў перастаноўкі ва ўрадзе. Ён падкрэсліў, што «прыняў да ўвагі крытыку, належным чынам выказаную грамадзянамі ў дачыненні да дзейнасці пэўных міністэрскіх сектараў».

### У Ізраілі адбылася найбуйнейшая экалагічная катастрофа



Дзясяткі тон мазуту выкінула на большую частку міжземнаморскага ўзбярэжжа Ізраіля. Мясцовыя ўлады кажуць аб найбуйнейшай экалагічнай катастрофе ў гісторыі краіны, паведаміла «Бі-бі-сі». Тысячы валанцёраў і салдат дапамагаюць ачысціць узбярэжжа ад згустка мазуту, які ўжо нанёс сур'ёзную шкоду дзікай прыродзе. На пацярпелых участках выяўленыя мёртвыя чарапахі, рыбы і птушкі, чые астанкі афарбаваны ў чорны колер. Улады Ізраіля спрабуюць устанавіць прычыну забруджвання: па папярэдніх даных, гаворка ідзе аб уцечцы паліва з карабля. Каб высветліць, з якога менавіта судна магла адбыцца ўцечка, спецыялісты вывучаюць спадарожнікавыя здымкі і напрамак хваль.

Блізкая ўлада

# Выслухаць і дапамагчы

**Больш за 40 зваротаў ад жыхароў Гомельшчыны прыняў старшыня аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ падчас прамой тэлефоннай лініі.**



Так, пенсіянер, жыхар аграгарадка Чырвонае, што ў Гомельскім раёне, паскардзіўся на неналежную чыстку вуліцы ў снегапады: — Высыпалі пад вароты коўш снегу, а ў мяне няма сіл яго прыбраць, я інвалід, хаджу з кіем, — прызнаўся мужчына. На тое, што дзеці ў школу вымушаны з-за гурбаў ісці паўскрай ажыўленай шашы, наракала таксама жыхарка аграгарадка Чырвонае:

— Там няма агароджы. Гэта небяспечна, — звярнула ўвагу жанчына. — А пасля снегападу ўвесь прыбраны снег згрузілі на дарожку, і цяпер школьнікам даводзіцца рабіць сцяжынкі па высокіх гурбах.

Жыхар аграгарадка Васільеўка Добрушскага раёна распавёў, што ў яго населеным пункце ад снегу прыбраныя толькі цэнтральныя вуліцы, па тых жа, што на ўскраіне, цяжка праехаць машынам. Не ўсе вуліцы ачышчаны ад снегу і ў вёсцы Раманавічы Гомельскага раёна, звярнуў увагу мясцовы жыхар. У некаторых месцах не могуць праехаць машыны для вывазкі смецця.

Генадзь Салавей даручыў адказным службам ацаніць і выправіць сітуацыю па ўсіх адзначаных населеных пунктах.

Адразу шэсць званкоў паступіла ад гамяльчан — жыхароў аднаго з дамоў па вуліцы Воськіна.

— Наш мікрараён малады. Інфраструктура яшчэ не развітая, і многія бацькі возяць дзяцей у садкі, школы ў іншыя мікрараёны, самі ездзяць на работу. Таму аўтамабіль для нас — не раскоша, а неабходнасць. Але сутыкнуліся з праблемай, што наш двор тупіковы, паўнавартасны паркоўкі няма. На 144 кватэры ўсяго 50 паркавачных месцаў, — растлумачылі сітуацыю грамадзяне. Яны адзначылі, што іх дом кааператыўны і паркавачныя месцы павінны быць прадугледжаны пад кожную кватэру.

— Чаму гэта не было зроблена, у чым прычына — трэба разабрацца. Будзем вывучаць, — адказаў на зварот гамяльчан Генадзь Салавей.

Між тым, жыхароў аграгарадка Яроміна Гомельскага раёна хвалюе якасць вады.

— Пабудавалі станцыю абезжалезвання. Але вада ўсё роўна пахне жалезам. Пасля нашых званкоў нешта рэгулююць, наладжваюць, але хапае максімум тыдні на два, — адзначыла ў сваім звароце мясцовая жыхарка.

На прамую лінію да губернатара звярнуліся фермеры з аграгарадка Урыцкае Гомельскага раёна і Судкова Хойніцкага раёна. Яны пацікавіліся магчымасцю выдзялення зямлі.

— Мы разгледзім работу фермераў, ацэнім эфектыўнасць іх дзейнасці, каб прыняць канкрэтныя рашэнні, — адзначыў Генадзь Салавей.

Таксама магчымасцю пакінуць свой зварот на прамой лініі кіраўніка рэгіёна скарысталіся жыхары Хойніцкага і Брагінскага раёнаў. Грамадзяне папрасілі скарэктаваць маршруты або расклад руху грамадскага транспарту. Падчас тэлефоннай лініі былі агучаны і падзякі ад жыхароў у адрас кіраўніцтва аблвыканкама.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

Вынікі і планы

# ЦАНАВАЯ СТАБІЛЬНАСЦЬ І НІЗКІЯ ТЭМПЫ ІНФЛЯЦЫІ

**У Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь адбылося выніковае пасяджэнне калегіі, у ходзе якога разгледжаны пытанні антыманапольнага і цанавога кантролю ва ўмовах новых выклікаў 2021 года, паведамляе афіцыйны сайт МАРГ.**

**Першы намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Мікалай СНАПКОЎ** абазначыў ключавыя задачы, пастаўленыя перад МАРГ. Сярод іх — падтрыманне цанавой стабільнасці, захаванне даступнасці сацыяльна значных тавараў, абарона і стымуляванне ўнутранага рынку, удасканаленне сістэмы дзяржаўных закупак, у тым ліку ліквідацыя нядобрасумленнага пасярэдніцтва ў гэтай сферы, адстойванне інтарэсаў беларускіх прадпрыемстваў на рынках краін-партнёраў у рамках міжнароднай павесткі па абароне канкурэнцыі.

Мікалай Снапкоў адзначыў, што падыходзіць да вырашэння пытанняў у галіне цанавога рэгулявання варта сістэмна, ліквідуючы структурныя праблемы, удасканальваючы метадалагічную базу, працуючы над зніжэннем інфляцыйных чаканняў насельніцтва.

**Першы намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Іван ВЕЖНАВЕЦ** запэўніў, што ў фокусе ўвагі МАРГ будзе падтрыманне цанавой стабільнасці — выкананне прагнознага паказчыка па ўзроўні інфляцыі, даступнасць жыццёва важных для насельніцтва тавараў, дасягненне мэтавага арыенціру па ўзроўні цэн на сацыяльна значныя тавары, а таксама абарона ўнутранага рынку ў адпаведнасці з Дактрынай нацыянальнай харчовай бяспекі, абарона прынцыпаў канкурэнцыі на знешніх рынках і ўзмацненне кантролю ў рэгуляваных сферах.

На падтрыманне цанавой стабільнасці і нізкіх тэмпаў інфляцыі ў сярэднетэрміновым перыядзе накіраваны мерапрыемствы Антыінфляцыйнай праграмы на 2021—2023 гады.

Работа па абароне ўнутранага рынку арганізавана ў адпаведнасці са спецыяльна распрацаваным комплексам мер.

Іван Вежнавец падкрэсліў, што самі па сабе, без карпатлівых намаганняў, уцягнутасці і зацікаўленасці кожнага, прынятыя дакументы працаваць не будуць і не прынясуць жаданага выніку. Толькі сумеснымі намаганнямі можна пераадолець усе выклікі 2021 года для падтрымання нізкага ўзроўню інфляцыі і ўстойлівых тэмпаў эканамічнага росту.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# САМЫ ВАЖНЫ КІРУНАК —

## падрыхтоўка да Алімпійскіх гульняў

**У Міністэрстве спорту і турызму адбылася калегія «Аб выніках работы галіны ў 2020 годзе і задачах на 2021 год» з удзелам намесніка прэм'ер-міністра Ігара ПЕТРЫШЭНКІ, першага віцэ-прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта Віктара ЛУКАШЭНКІ, намесніка міністра адукацыі Аляксандра КАДЛУБАЯ.**

**Міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК** адзначыў, што мінулы год быў дастаткова цяжкі, апошнія шэсць месяцаў спартыўная грамадскасць аказалася пад беспрэцэдэнтным палітычным ціскам, што не магло не адбіцца негатыўна на рабоце галіны ў цэлым. Па словах міністра, з гэтых падзей вынесены пэўныя ўрокі. Цяжкім мінулы год стаў і праз пандэмію каранавіруса. Быў прыпынены выезд на замежныя зборы беларускіх спартсменаў. Аднак з гэтай сітуацыяй справіліся, у першую чаргу дзякуючы зладжаным дзеянням медперсаналу. Былі вызначаны чатыры «чыстыя» базы для размяшчэння нацыянальных зборных — рэспубліканскія цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі «Стайкі», «Раўбічы», РЦАП па вяслярных відах спорту і РЦАП па конным спорце і конегадоўлі «Ратамка». Адначасова там размяшчалася каля 300 спартсменаў, дзякуючы чаму ўдалося пазбегнуць маштабных успышак захворвання. Агульная захваральнасць сярод спартсменаў і трэнераў нацыянальных каманд склала каля 4 %.

Сяргей Кавальчук падкрэсліў, што самы важны і адказны кірунак для міністэрства ў гэтым годзе — падрыхтоўка да летніх Алімпійскіх гульняў у Токіа. Зараз яе вядзе каля 260 спартсменаў па 26 відах спорту. Кваліфікацыйныя патрабаванні для ўдзелу ў Алімпійскіх гульнях выканалі 47 беларускіх спартсменаў у 16 відах спорту. Плануецца, што да завяршэння адборачнага перыяду ў беларусаў будзе 110—120 ліцэнзій.

Адзін з найважнейшых кірункаў дзейнасці спартыўнай галіны — падрыхтоўка рэзерву. У 2020 годзе зменена напаўняльнасць груп, перагледжаны падыходы да прысваення трэнерам кваліфікацыйных катэгорый, удасканалена сістэма камплектавання вучылішчаў алімпійскага рэзерву з прыцэлам на развіццё прыярытэтных відаў спорту. У мінулым годзе шмат увагі аддавалася развіццю масавай фізічнай культуры, асабліва ў рэгіёнах. Упершыню ў галіновую праграму «Фізічная праграма і спорт» на 2021—2025 гады ўключана будаўніцтва спартыўных аб'ектаў. Згодна з праграмай, у найбліжэйшыя пяць гадоў у рэгіёнах краіны з'явіцца 32 новыя спартыўныя аб'екты.

Міністр спорту і турызму таксама адзначыў, што найбольш ад пандэміі каранавіруса пацярпела турыстычная сфера. У сувязі з гэтым першачарговыя пытанні — падтрымка турызму, у тым ліку пераарыентацыя на ўнутраны і ўязны турызм.

Па словах Сяргея Кавальчука, пры шматлікасці аспектаў жыццядзейнасці галіны ўсе задачы на найбліжэйшыя паўгода зводзяцца да аднаго: забяспечыць якасную падрыхтоўку і ўдзел беларускіх спартсменаў у Алімпійскіх гульнях.

Своеасаблівыя вынікі калегіі Мінспорту падвёў Ігар Петрышэнка. Ён вызначыў шэраг задач для спартыўнай галіны на найбліжэйшы час. «Мы павінны даказаць, што Беларусь — спартыўная краіна. У Японіі нам трэба выступіць як мінімум лепш, чым на папярэдніх дзвюх алімпіядах», — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Па матэрыялах прэс-службы Міністэрства спорту і турызму.**

# НА ЛІНЕЙЦЫ ГАТОЎНАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У рамонтнай зоне мехдвара Ілья прапануе паназіраць за работай трактарыста-машыніста Дзмітрыя Чачухі. Ён адказвае за тэхабслугоўванне трактароў, камбайнаў, сельгасмашын. Адзін з тых, хто ў калектыве на вагу золата, так прадстаўляе механіка загадчык рамонтнай майстэрні.

«Толькі скончыў работу, рабіў гідраўліку і разбіраўся з трансмісіяй», — расказвае трактарыст-машыніст. За дзве працоўныя змены ён падрыхтаваў трактар да новага сезона. Шчыры ў рабоце механік Дзмітрый Чачуха ў гаспадарцы не так даўно. Сам родам з-пад Мінска, на Гомельшчыну, кажа, прывяло каханне, тут радзіма яго жонкі, агранома па спецыяльнасці. «У сёлетні сезон пайду працаваць на корманарыхтоўчы камбайн, — дзеліцца Дзмітрый. — Рыхтаваць машыну пачну ўжо ў час сяўбы, каб да пачатку нарыхтовак зялёнай масы ўсё было гатова».



Фота Марыны ВАСІЛЬЕВАЙ.

Інтэрв'ю сабкару «Звязды» дае загадчык рамонтнай майстэрні КСУП «Урыцкае» Ілья ГЕРАСІМЕНКА.

Дарэчы, усе механікі гаспадаркі цяпер задзейнічаны ў падрыхтоўцы да пасяўной. Слесары рамонтнага ўчастка, майстэрні, сельгасучастка і аўтамабільнага парку прыходзяць на дапамогу адзін аднаму, калі ўзнікае такая патрэба. Той, хто не задзейнічаны на вывазцы арганікі, падвозе кармоў, — таксама дапамагае ў майстэрнях.

Сёлетняя яравая сяўба КСУП «Урыцкае» — гэта 800 гектараў збожжавых, 50 гектараў грэчкі, 20 гектараў бульбы і 10 гектараў гароднінны. Значную частку кліна ў гаспадарцы зойме «царыца палёў»: пад кукурузу тут адведзена 2800 гектараў.

Дарэчы, актыўна рыхтуюць тэхніку і агрэгаты да веснавых палявых работ сёння ва ўсіх дзесяці сельскагаспадарчых прадпрыемствах Гомельскага раёна. Па словах намесніка начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Гомельскага райвыканкама Мікалая Лясько, да работ прыступілі адразу пасля заканчэння асенніх палявых работ. Перад інжынернымі службамі сельгаспрадпрыемстваў пастаўлена задача прывесці ў поўную тэхнічную спраўнасць трактары, прычэпы і агрэгаты. У сяўбе-2021 на тэрыторыі Гомельскага раёна будзе задзейнічана 416 трактароў, з іх 68 — энерганасычаныя, 24 пасяўныя камбінаваныя агрэгаты і 12 зерневых сеялак розных мадыфікацый. У гаспадарках раёна ў пасяўную будуць працаваць 45 машын для ўнясення мінеральных угнаенняў.

Між тым у сёлетнюю пасяўную кампанію дапамогу аграрыям рэгіёна плануе аказваць ААТ «Гомельаблаграсэрвіс». На прадпрыемстве нацэлены развіваць новую паслугу: арганізуюць на сваёй базе механізаваны атрад. Ён стане добрай падмогай для гаспадарак, якія не будуць паспяваць спраўляцца з пэўнымі палявымі работамі ў неабходныя тэрміны. Для работы мехатрад забяспечаць усёй неабходнай тэхнікай.

Для аграрыяў імкнуцца стварыць належныя ўмовы для тэрміновай закупкі неабходных угнаенняў. Па аператыўнай інфармацыі Мінсельгасхарча аб ходзе сельгасработ, на пачатак тыдня ў Гомельскай вобласці мінеральных угнаенняў пад сяўбу ярыны назапашана звыш 53 тысяч тон, гэта амаль чвэрць ад запланаванага.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Надвор'е

# Адлігу ўжо не спыніш?

## У чацвер прыгрэе не па-лютаўску — да 12 цяпла

**Тая адліга, якая прыйшла да нас у пачатку тыдня, у найбліжэйшыя суткі злёгку запаволіцца. Усё таму, што ў аўторак праз суседнія вобласці Расіі прагназуецца ссоўванне чарговага халоднага антыцыклону, які закране і нашу краіну. Але далей нас чакае паступленне цёплага паветра з боку паўднёвага захаду Еўропы. Таму будзе сонечна і, як вясной, цёпла, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень прагназуецца павелічэнне воблачнасці, у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах магчымы слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад нуля да мінус 6 градусаў, па ўсходзе — 7—13 марозу. Удзень па паўднёвым захадзе краіны будзе 1—7 цяпла.

А вось у сераду наша краіна апынецца пад уплывам франтальнай сістэмы, якая ссоўваецца з боку Заходняй Еўропы. Цяпло пачне павольна вяртацца. Будзе воблачна з праясненнямі. Уначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі, удзень месцамі, у асноўным па ўсходзе краіны, пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, які будзе пераходзіць у дождж. Месцамі чакаюцца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёвы з пераходам на заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла, па ўсходзе краіны — 6—9 марозу, пры праясненнях — да мінус 10—14 градусаў. Удзень будзе ад 3 марозу па ўсходзе да плюс 8 градусаў па паўднёвым захадзе краіны.

Сапраўды добрае цяпло прыйдзе да нас ужо ў чацвер. У гэты дзень надвор'е будуць вызначаць у асноўным вобласць павышанага атмасфернага ціску і цёплая паветраная маса, якая паступае з паўднёвага захаду Еўропы. Паменшыцца воблачнасць. У асноўным абыдзецца без ападкаў, толькі ўдзень у асобных раёнах па паўночным усходзе краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Месцамі магчымы туман, уначы і раніцай — слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Вецер прагназуецца заходні ўмераны, удзень месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла. Удзень будзе плюс 3—9 градусаў, па паўднёвым захадзе — наогул 10—12 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у канцы тыдня і ў гэтыя выхадныя цыклон і актыўныя франтальныя раздзелы будуць праходзіць далёка ад тэрыторыі нашай краіны. Ападкі будуць выпадаць толькі месцамі. Заходнія і паўночна-заходнія ветры будуць «пастаўляць» цёплае акіянічнае паветра, і ў многіх раёнах захаваецца адлігнае надвор'е. А там, глядзіш, і зіма скончыцца.

**Сяргей КУРКАЧ.**


**Вниманию предприятий, организаций, индивидуальных предпринимателей и физических лиц!**

Комитетом «Гроднооблимущество» проводится аукцион по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района.

К продаже предлагаются:

**1. Изолированное помещение (фельдшерско-акушерский пункт с верандой) в Волковысском районе по адресу: Субочский с/с, д. Красный Груд, 12А-1.**

Аукцион состоится 25 февраля 2021 года в 12.30.

**2. Здание ФАПа в д. Вехотница, 47, 47/1, Русский с/с Волковысского района.**

Аукцион состоится 25 февраля 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: город Гродно, улица 17 Сентября, 39.

Подробная информация размещена на сайте https://au.nca.by.

Справки по телефонам:
в городе Волковыске — (8 01512) 5 13 44;
в городе Гродно — (8 0152) 62 39 24, 62 39 23, 62 39 31.

УНП 500007288

## З нагоды

### Сёлета Дзень абаронцаў Айчыны напаўняецца асаблівым сэнсам

Аб гэтым заявіў **міністр абароны Віктар ХРЭНІН** перад урачыстым сходам і святочным канцэртам, прысвечаным Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Беларусі, у Палацы Рэспублікі, паведаміла БелТА.

«Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Беларусі сёння святкуецца ў кожнай сям'і. Гэта нас аб'ядноўвае і асабліва актуальна ў Год народнага адзінства», — адназначыў Віктар Хрэнін. Міністр заўважыў, што ёсць шмат краін, якія багацейшыя, чым наша рэспубліка, але ні адна дзяржава не замяніць Радзіму беларусам. «Думаю, так лічыць большасць нашых грамадзян. Нам ёсць што абараняць, ёсць што захоўваць і заўсёды будзе што прымнажаць, — падкрэсліў ён. — І я ўпэўнены, што мы ўсе можам ганарыцца ратнай працай нашых вайскоўцаў, бо яны сёння захоўваюць мір на нашай зямлі».

Палігон

# Тэрыторыя абароны

**На базе вучэбнага цэнтра 6-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады на палігоне Гожскі пад кіраўніцтвам міністра абароны Віктара Хрэніна прайшоў спецыяльны збор. На яго былі запрошаны старшыні аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, іх намеснікі і кіраўнікі ваенных камісарыятаў. Збор праводзіўся для таго, каб павысіць узровень ведаў кіраўніцтва рэгіёнаў у пытаннях сумесных дзеянняў у сучасных узброеных канфліктах, а таксама ўдасканаліць навыкі пры абыходжанні са зброяй.**



Месцам правядзення збору палігон быў выбраны наўмысна. Акцэнт рабіўся на практычны складнік. Высокія госці ўбачылі сумесныя дзеянні пагранічнікаў, Узброеных Сіл, тэрытарыяльнай абароны па прыкрыцці Дзяржаўнай граніцы, знішчэнні незаконнага ўзброенага фарміравання. Пазнаёмілі кіраўнікоў рэгіёнаў і з сучаснымі ўзорамі ўзбраення, тэхнікі, сродкаў сувязі.

Таксама ў праграму збору былі ўключаны і стрэльбы са зброі, якая стаіць на ўзбраенні.

— Прынцып «рабі як я» ніхто не адмяняў. Кіраўнік, які адказвае за арганізацыю тэрытарыяльнай абароны, павінен сам умець прымяняць усе віды ўзбраення і ваеннай тэхнікі, якія будуць у яго ў распараджэнні, — адзначыў **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.** — Становішча сёння ў свеце вельмі няпростае. Некаторыя палітыкі, вырашаючы свае геапалітычныя задачы, спрабуюць развязаць на тэрыторыі сумежных краін узброеныя канфлікты, справакаваць каляровыя рэвалюцыі і пасеяць хаос. Таму пытанні ваеннай, нацыянальнай бяспекі ў нашай краіне вельмі важныя.



Сёлета ў краіне стартуе новы этап развіцця тэрытарыяльнай абароны.

— Кіраўнік дзяржавы неаднаразова падкрэсліваў важнасць надання ўсенароднага характару абароне нашай Радзімы, дзе асноўнай формай і з'яўляецца тэрытарыяльная, — адзначыў **міністр абароны Віктар ХРЭНІН.** — Аддаецца вялікая ўвага пытанням яе ўдасканалення, падрыхтоўкі ваеннага рэзерву, павышэння эфектыўнасці стратэгічнага стрымлівання. Створана шматузроўневая сістэма падрыхтоўкі кіраўнікоў рознага ўзроўню, якія адказваюць за выкананне задач па тэрытарыяльнай абароне. Практыка паказала, што падобныя зборы дазваляюць падтрымліваць на належным узроўні іх навыкі, пашыраць веды, разуменне пытанняў тэрытарыяльнай абароны.

Міністр абароны асобна адзначыў, што кіраўнікі мясцовых органаў улады дзейнічаюць вельмі ўпэўнена.

— Гэта сведчыць пра тое, што мы выйшлі на добры ўзровень падрыхтоўкі. І, канешне ж, асобна трэба згадаць ваеннаабавязаных. Людзі адрываюцца ад сваіх штодзённых абавязкаў, выходзяць з зоны камфорту, але за кароткі час аднаўляюць навыкі і ў цэлым падчас збораў дэманструюць нядрэнную падрыхтоўку. Відаць, што яны зацікаўлены ў гэтым.

Кіраўнік ваеннага ведамства таксама паведаміў, што сёлета плануецца вялікае камандна-штабное вучэнне з тэрытарыяльнымі войскамі. Пройдзе яно ў чэрвені на тэрыторыі Брэсцкай вобласці. Па яго словах, адной з дзейсных формаў падрыхтоўкі падраздзяленняў тэрытарыяльнай абароны застаецца правядзенне раптоўных праверак. Цяпер у ёй задзейнічаны падраздзяленні Віцебскай вобласці.

**Фота БелТА.**

Мадэрнізацыя

# СУВЯЗІСТЫ АТРЫМАЛІ ТЭХНІКУ

**Напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл прадстаўнікі злучэнняў і воінскіх часцей беларускай арміі атрымалі сучасныя лічбавыя сродкі і комплексы сувязі. Урачыстая цырымонія адбылася на пляцы 86-й брыгады сувязі.**

— Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь былі і застаюцца ў сучасным трэндзе развіцця ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі, — заявіў **старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, генерал-маёр запасу Алег БЕЛАКОНЕЎ.** — Дваццаць гадоў таму мы маглі толькі марыць аб тых узорах, якія сёння ўвасоблены. І я ганаруся тым, што наша армія адпавядае патрэбам развіцця геапалітычнай сітуацыі.

Каля сарака адзінак тэхнікі сувязі былі як зроблены на прадпрыемствах Дзяржкамваенпрама, так і мадэрнізаваны непасрэдна ў вайсковых часцях. Упершыню ставяцца на ўзбраенне камбінаваныя радыёстанцыі Р-186, Р-186Д, комплексныя апаратныя сувязі П-240МБ. Але новыя ўзоры далёка не першыя. Гэта адзначыў і **першы намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл, генерал-маёр Ігар КАРОЛЬ.**

— Гэта толькі адзін з этапаў планавага пераўзбраення нашай арміі. Без сувязі няма кіравання, а без кіравання няма перамогі. Таму перааснашчэнне войскаў сувязі з'яўляецца прыярытэтам. Галоўны сэнс удасканалення сістэмы кіравання войскамі — узаемадзеянне на ўсіх узроўнях, ад стратэгічнага да тактычнага, ад генерала да салдата ў інтарэсах увасаблення рашэнняў



палітычнага і ваеннага кіраўніцтва, — адзначыў Ігар Кароль. — Пры гэтым у войска паступае тэхніка, зробленая не толькі на айчынных прадпрыемствах, але і ў Расіі. Напрыклад, сёлета паступяць два батальённыя камплекты найноўшых бронетранспарцёраў БТР-82, а таксама звяно шматфункцыянальных знішчальнікаў Су-30СМ. Тэхніка, якую мы бачым сёння, будзе задзейнічана ў поўным аб'ёме на сумесным вучэнні Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі «Захад-2021».

Перададзеныя комплексы сувязі перш за ўсё арыентуюцца на тактычнае звяно кіравання. Адметна, што камандзіры асобных батальёнаў цяпер займелі доступ да спадарожнікавай сувязі. У сваю чаргу, гэта палепшыць папераджальную гатоўнасць сістэмы сувязі адносна патрэб у ёй органаў ваеннага кіравання.

— Можна сказаць без перабольшання, што наша краіна валодае ўласнай вытворчасцю ваеннай тэхнікі сувязі ва ўсіх асяроддзях і дыяпазонах, — заявіў **начальнік сувязі Узброеных Сіл — начальнік упраўлення сувязі Генеральнага штаба Узброеных Сіл, генерал-маёр Алег МІШЧАНКА.** — Узоры, якія былі перададзены, суперсучасныя. Яны адпавядаюць усім патрабаванням да своечасовасці, дакладнасці, перашкодаўстойлівасці, бяспекі і гарантаванай трываласці сувязі. Яшчэ не так даўно асноўным спосабам арганізацыі сувязі ў войсках была радыёсувязь. Цяпер жа ўпор зроблены на спадарожнікавыя сістэмы, якія грунтуюцца на нацыянальнай сістэме спадарожнікавай сувязі і вяшчання. Увогуле, лічбавізацыя сродкаў сувязі батальённага звяна кіравання, насычэнне злучэнняў і вайсковых часцей перадавымі ўзорамі дазволяць у далейшым удасканальваць аўтаматызаваную сістэму кіравання Узброенымі Сіламі.

Узоры айчынных сродкаў сувязі па сваім функцыянале не саступаюць замежным аналагам. Па некаторых параметрах яны нават іх пераўзыходзяць. Яны забяспечваюць аўтаматызаваную, бесперапынную, устойлівую і ўтоеную перадачу даных. Для гэтага выкарыстоўваецца шырокі спектр каналаў сувязі: провад, радыё і спадарожнік.



Падрабязнасці

# НА ВАРЦЕ ЗДАРОЎЯ

**У Ваеннай акадэміі Беларусі пасля рамонту і мадэрнізацыі адкрылася паліклініка з лазарэтам на 60 ложкаў. Яна разлічана на тое, што атрымаць у ёй кансультацыі і медыцынскую дапамогу змогуць да 4,5 тысячы чалавек, паведамілі ў Міністэрстве абароны.**

У цырымоніі адкрыцця ўзяў удзел **міністр абароны Беларусі, генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН.**

— Паліклініка стала прасторнейшай. Яна ўкамплектавана новым дыягнастычным і лячэбным абсталяваннем. Тут створаны камфортныя ўмовы і для работы персаналу, і для наведвальнікаў. Увогуле, апошнім часам увесь свет адчуў, як шмат залежыць ад узроўню развіцця медыцыны. А ва Узброеных Сілах заўсёды ў аснову ставілі клопат пра здароўе вайскоўцаў. І за апошні час зроблена шмат чаго ў гэтым плане, падкрэсліў Віктар Хрэнін. Так, летась мы адкрылі пасля капітальнага рамонту самае вялікае медыцынскае падраздзяленне — медыцынскую роту 72-га аб'яднанага навучальнага цэнтра.

Міністр абароны асобна падзякаваў будаўнікам. Ён адзначыў, што былі выкананы ўсе дагаворныя тэрміны, дзякуючы чаму аб'ект быў здадзены якраз да 23 лютага. Тым самым атрымаўся добры падарунак для вайскоўцаў.

Сёлета гэта не апошняе абнаўленне для Ваеннай акадэміі. Мяркуецца, што неўзабаве пачнуцца маштабныя работы ў галоўным корпусе і ў адным з інтэрнатаў. А на наступны год запланаваны рамонт казармы і клуба «Ракетчык».

**Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Абаронцы

# У БАЯХ СПАЗНАЛІ РАДАСЦЬ ПЕРАМОГ




**23 лютага штогод у Рэспубліцы Беларусь урачыста адзначаецца Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл. Гэтае сапраўды ўсенароднае свята вельмі важнае для ўсіх людзей нашай краіны і нясе ў сабе сімвалічнае яднанне мінулага і сучаснасці. У гэты дзень мы віншуем усіх тых, хто прайшоў суровымі франтавымі дарогамі, абараніў нашу свабоду і незалежнасць у гады Вялікай Айчыннай вайны, хто быў прыкладам самаахвярнага служэння Айчыне ў пасляваенны перыяд, з доблесцю і гонарам выконваў інтэрнацыянальны абавязак, сваёй ратнай працай мацаваў баявую сілу Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі. Яркія старонкі ў слаўны летапіс нашай краіны ўпісала 120-я гвардзейская Рагачоўская Чырванасцяжная, ордэнаў Суворава і Кутузава асобная механізаваная брыгада імя Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. З 1945 года злучэнне дыслацыруецца ў сталічным мікраёне Уручча. Ужо сама назва і ўзнагароды на Баявым сцягу гэтага сапраўды легендарнага, ардэнаноснага злучэння сведчаць пра многае.**



Гісторыя і баявы шлях славутага злучэння падрабязна апісаны ў фундаментальнай працы «Чырванасцяжная Беларуская ваенная акруга», выпушчанай у свет Ваенвыдам у 1983 годзе пад рэдакцыяй вядомага савецкага военачальніка, ураджэнца вёскі Чарэя Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, камандуючага войскамі акругі генерала арміі Яўгена Іваноўскага. З гэтага выдання чытачы даведаюцца, што па загадзе Вярхоўнага Галоўнакамандавання ў найцяжэйшы перыяд Вялікай Айчыннай вайны — у першым паўгоддзі 1942 года — на базе Першага Омскага ваенна-пяхотнага вучылішча імя М. В. Фрунзэ Сібірскай ваеннай акругі была сфарміравана 308-я стралковая дывізія. Дата ўтварэння дывізіі — 21 сакавіка. Пад камандаваннем прызванага ў шэрагі Чырвонай Арміі ў 1919-м былога начальніка вучылішча палкоўніка Лявонція Гурцьева баявое хрышчэнне байцы і камандзіры атрымалі каля сцен Сталінграда.

Удзельнік гэтай грандыёзнай бітвы, вядомы савецкі пісьменнік Васіль Гросман у нарысе «Напрамак галоўнага ўдару» пісаў: «Аператыўнае аддзяленне падлічыла астранамічную колькасць бомбаў, скінутых немцамі на дывізію. Гэта лічба з чатырма нулямі... Гэтым грукатам можна было аглушыць чалавецтва, гэтым агнём і металам можна было спаліць дзяржаву. Немцы лічылі, што зламаюць маральную сілу сібірскіх палкоў. Яны меркавалі, што перакрылі мяжу супраціўлення чалавечых сэрцаў і нерваў. Але дзіўная справа: людзі не сагнуліся, не звар'яцелі, не страцілі кантроль над сваімі сэрцамі і нервамі, а сталі больш моцнымі і спакойнымі. Гераізм стаў бытам, гераізм стаў стылем дывізіі і яе людзей, гераізм стаў будзённай, штодзённай звычкай. Гераізм усюды і ва ўсім...»



Мемарыял дывізіі.

За ўзорнае выкананне баявых заданняў у вялікай бітве на Волзе 308-я дывізія ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга, а ўсе ўдзельнікі — медалём «За абарону Сталінграда». 12 ліпеня 1943 года дывізія ўступіла ў бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на Курскай дузе. У жніўні-верасні 1943-га вызваляла Бранск, Клімавічы, Касцюковічы. За мужнасць і гераізм, праяўленыя асабовым складам злучэння ў баях на Арлоўскім напрамку, 308-я стралковая дывізія загадам Наркама Абароны СССР № 285 ад 23 верасня 1943 года перайменавана ў 120-ю гвардзейскую стралковую Чырванасцяжную дывізію.

У другой палове лютага 1944-га ў ходзе Рагачоўска-Жлобінскай наступальнай аперацыі дывізія фарсіравала Дняпро, ва ўзаемадзеянні з іншымі злучэннямі 3-й арміі прарвала добра ўмацаваную абарону нямецка-фашысцкіх войскаў. Перамяшчэнне савецкіх войскаў да Рагачова адлюстравана ў журнале баявых дзеянняў арміі, дзе адзначана, што, «фарсіраваўшы Дняпро, стралковыя дывізіі ўдарнай групы (120-й гвардзейскай, 5-й, 283-й, 186-й стралковых дывізій) прарвалі абарону праціўніка на ўсю тактычную глыбіню. На другі дзень праціўнік перакінуў рэзервы са Жлобіна і Быхава. Пераадольваючы ўпартае супраціўленне ворага, пяхота прасунулася за суткі на 4-5 км».

Камандуючы 3-й арміяй, генерал Аляксандр Гарбатаў у мемуарах «Гады і войны» ўспамінаў: «За чатыры дні наступальных баёў мы дасягнулі немалых вынікаў. Нашы войскі вызвалілі Рагачоў, перарэзалі важную для праціўніка чыгуначную лінію Жлобін — Магілёў. І нарэшце, мы захапілі плацдарм на рацэ Друць». Асабліва вызначыўся асабовы склад 120-й гвардзейскай стралковай дывізіі, якой камандаваў палкоўнік (з чэрвеня 1944 г. — генерал-маёр) Фогель Ян Янавіч, у баях за горад Рагачоў. У навукова-папулярным выданні «Гурцьеўцы ад Омска да Берліна» ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, былы міністр абароны СССР, Маршал Савецкага Саюза Дзмітрый Язаў адзначаў: «На поўнач ад Рагачова 120-я гвардзейская стралковая дывізія з баямі прасоўвалася наперад. Да 6 гадзін раніцы цэнтральная частка горада была цалкам вызвалена. Да 9 гадзін 30 хвілін воінамі дывізіі была занята і паўночная частка Рагачова. У вулічных баях праціўнік страціў каля 500 салдат і афіцэраў». Загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага 26 лютага 1944 года дывізіі прысвоена ганаровае найменне «Рагачоўская».

У Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён» дывізія ў складзе 1-га Беларускага фронту брала ўдзел у прарыве глыбока эшаланіраванай абароны праціўніка і акружэнні яго буйной групоўкі ў раёне горада Бабруйска і развіцці наступлення ў напрамку Навагрудка, Ваўкавыска. Разам з іншымі злучэннямі 3-й арміі дывізія фарсіравала Бярэзіну, Нёман, Шчару, удзельнічала ў вызваленні больш як 500 населеных пунктаў Беларусі і Польшчы, у тым ліку Бабруйска, Мінска, Ваўкавыска. 27 ліпеня ўдзельнічала ў штурме Беластока. За адзнаку ў гэтых баях ўсе яе палкі былі ўдастоены ганаровага наймення «Беластоцкія». Затым дывізія праследавала фашысцкія войскі, фарсіравала Одэр, удзельнічала ў поўнай ліквідацыі нямецкіх войскаў на паўднёвым усходзе ад Берліна.

У гады Вялікай Айчыннай вайны восем вайскоўцаў дывізіі былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза, пяцёра сталі поўнымі кавалерамі ордэна Славы, ордэнамі і медалямі было ўзнагароджана каля 11 000 салдат, сяржантаў і афіцэраў. Сярод герояў — камандзіры дывізіі генерал-маёр Лявонцій Гурцьеў, генерал-маёр Ян Фогель, палкоўнік Павел Пятроў, старшы лейтэнант Іван Чупілка, старшы лейтэнант Якаў Зайцаў, сяржант Іван Багданаў, яфрэйтар Хасан Мамутаў, радавы Пётр Панамароў.

У 1957 годзе дывізія былаператворана ў мотастралковую. У пасляваенны час за заслугі ў справе абароны Савецкай Радзімы, высокія вынікі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы 120-й гвардзейскай дывізіі прысвоена імя Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, яна ўзнагароджана Памятным Сцягам і Ленінскай юбілейнай Ганаровай граматай ЦК КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савета Міністраў СССР. Тройчы гвардзейцы ўзнагароджваліся пераходным Чырвоным Сцягам Ваеннага Савета Сухапутных войскаў. Двойчы — вымпелам Міністра абароны СССР «За мужнасць і воінскую доблесць». 120-я гвардзейская мотастралковая дывізія брала ўдзел ва ўсіх найбуйнейшых вайсковых вучэннях і манеўрах: «Дняпро», «Нёман», «Дзвіна», «Вясна-75», «Бярэзіна», «Захад-81». У 1982 годзе на базе дывізіі быў утвораны 5-ы гвардзейскі асобны армейскі корпус, прызначаны для дзеянняў у якасці аператыўнай манеўранай групы фронту. У ходзе завяршальнага этапу рэфармавання Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь 120-я гвардзейская мотастралковая дывізія была перафарміравана ў 120-ю гвардзейскую асобную механізаваную брыгаду. «Бярэзіна-2002», «Шчыт Айчыны — 2004», «Восень-2008», «Захад-2009», «Шчыт Саюза — 2011» — ніводнае з гэтых буйнамаштабных вучэнняў Узброеных Сіл нашай краіны не прайшло без удзелу воінаў-рагачоўцаў.

На базе брыгады сфарміравана міратворчая рота — адзінае ў Рэспубліцы Беларусь падраздзяленне, прызначанае для выканання задач у ходзе міратворчых аперацый. У канцы кастрычніка 2015 года 120-ю асобную механізаваную брыгаду Паўночна-Заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь наведаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Ён азнаёміўся з узорамі мадэрнізаванага ўзбраення і ваеннай тэхнікі. Падчас наведвання вайсковага стрэльбішча Прэзідэнту прадэманстравалі ўзоры ваеннай тэхнікі, баявой формы адзення, экіпіроўкі і стралковай зброі. У музеі баявой славы злучэння кіраўнік дзяржавы пакінуў запіс у памятнай кнізе: «Народ Беларусі даверыў нам бяспеку Радзімы, мір і спакой на беларускай зямлі. Апраўдвайце гэты высокі давер сваёй ратнай працай у імя працвітання Айчыны». Высокае воінскае майстэрства, пераемнасць слаўных баявых традыцый франтавікоў прадэманстравалі воіны-рагачоўцы на ваенным парадзе ў гонар 75-годдзя Вялікай Перамогі 9 Мая 2020 года ў Мінску.

Сёння ў сталічным мікраёне Уручча адна з вуліц носіць імя Герояў 120-й дывізіі. У Першамайскім раёне Мінска ў гонар камандзіраў славутай дывізіі Герояў Савецкага Саюза Лявонція Гурцьева і Яна Фогеля названы вуліцы. У сталічных сярэдніх школах № 141 і № 70 імя Л. Гурцьева створаны музеі баявой славы 120-й гвардзейскай дывізіі.

**Мікалай ШАЎЧЭНКА,**
**падпалкоўнік у адстаўцы,**
**ветэран Чырванасцяжнай**
**Беларускай ваеннай акругі.**

# Урок мужнасці на прыкладзе сучаснікаў

**Днямі школьнікі Мачулішчанскай сярэдняй школы наведалі аэрадром 50-й змешанай авіяцыйнай базы пад Мінскам, дзе камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны генерал-маёр Ігар ГОЛУБ правёў Урок мужнасці напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.**

Ігар Голуб пагутарыў з хлопчыкамі і дзяўчынкамі аб важнай ролі арміі ў жыцці кожнага грамадзяніна краіны. Варта адзначыць, што сярод падлеткаў не было выпадковых людзей. Усе яны з'яўляюцца кадэтамі, якія мараць у будучыні стаць вайскоўцамі, у тым ліку ваеннымі лётчыкамі і авіятэхнікамі.

Камандуючы ВПС і войскамі СПА расказаў пра сябе, ролю ваеннай авіяцыі ў абараназдольнасці краіны, асаблівасці ваеннай службы ваенных лётчыкаў, на прыкладзе армейскіх авіятараў распавёў аб гістарычных і сучасных дасягненнях, аб новым узбраенні і ваеннай тэхніцы, ролі спецыялістаў лётна-тэхнічнага складу ў падтрыманні баявой гатоўнасці Узброеных Сіл. Таксама ён даў некалькі значных парад для выбару ваеннай прафесіі. І адказаў на ўсе ўзніклыя пытанні. Пасля гэтага гасцям паказалі ўзбраенне і ваенную тэхніку воінскай часці.

— На ўроках мужнасці мы хацелі данесці да моладзі разуменне таго, што абаронцам Айчыны можа быць не толькі чалавек, які праходзіць службу ва Узброеных Сілах, — распавёў Ігар Голуб. — Абаронца — гэта любы чалавек, які гатовы стаць на абарону сваёй Радзімы, сям'і і блізкіх. Галоўнай задачай было данесці дзецям тое, што ў нас ёсць свая гісторыя, якім чынам і сіламі былі дасягнуты мір і спакой пад небам краіны, каб моладзь ведала герояў,



загінулых у імя міру на палях бітваў, памятала і шанавала нашу гісторыю.

**Аляксандр ГАНЧАРОЎ.**
**Фота аўтара.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 25 марта 2021 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование лотов | Начальная цена продажи, бел. руб. с учетом НДС (20 %) | Сумма задатка, бел. руб. с учетом НДС (20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Помещение площадью 33,2 кв. м (25,1; 11,7)** в изолированном помещении – помещение связи с инв. № 350/D–213112, помещение на 4-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 1.0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66-2 | **140,27** | 14,03 |
| 2 | **Помещение площадью 19,1 кв. м** в изолированном помещении – помещение связи с инв. № 350/D-213112, помещение на 4-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 1.0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66-2. | **80,70** | 8,07 |
| 3 | **Помещение площадью 12,3 кв. м** в изолированном помещении – помещение связи с инв. № 350/D-213112, помещение на 4-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 1.0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66-2. | **51,97** | 5,20 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце** | Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232) 79-69-76 |
| **Срок подачи заявления** | **С 23.02.2021 г. по 23.03.2021 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) календарных дня до его проведения |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, **получатель – Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления) |
| **Условия пользования** | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств) |
| **Размер штрафа** | Лот № 1 – 2 (две) базовых величины, лот № 2 – 1 (одна) базовая величина, лот № 3 – 0,5 базовой величины согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги, от условий проведения аукционных торгов согласно действующему законодательству) |

**Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и представить необходимые документы:** копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляется оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения, за вычетом внесенной им суммы задатка. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база». **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| Лот № | Наименование | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|
| **1** | **Изолированное помещение** (административное помещение) общей площадью 176,3 кв. м, инвентарный номер 100/D-118656, по адресу: г. Брест, ул. Московская, 332/3Б-2 | 162 705,46 бел. руб. |
| **2** | **Изолированное помещение** (административное помещение) общей площадью 64,9 кв. м, инвентарный номер 100/D-118655, по адресу: г. Брест, ул. Московская, 332/3Б-1 | 60 345,36 бел. руб. |
| **3** | **Изолированное помещение** (административное помещение) общей площадью 122,8 кв. м, инвентарный номер 100/D-118659, по адресу: г. Брест, ул. Московская, 332/3Б-3 | 113 568,83 бел. руб. |

**Спецтехника, расположенная по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, д. Хоростово**

| Лот № | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| **5** | Опрыскиватель «Харди Коммандер Плюс», заводской № 007332, 2000 г. в. | 15 197,54 |
| **6** | Пресс-подборщик «Клаас Квадрант» 1150, заводской № 04500237, 2001 г. в. | 17 342,60 |
| **7** | Сеялка кукурузная «Кляйне Мультикорн» 6 р, заводской № 16-С40-012, 2000 г. в. | 13 795,73 |
| | **Спецтехника, расположенная по адресу: г. Орша** | |
| **8** | Прицепный Опрыскиватель «Амазоне» UX 5200, заводской № ГЧ00000657, 2008 г. в. | 41 467,06 |
| | **Спецтехника, расположенная по адресу: Минская обл., Минский р-н, пос. Луговая Слобода** | |
| **9** | Грузовой седельный тягач Renault Magnum, 2010 г. в., кузов VF617GKA000020331, 2010 г. в. | 36 692,38 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 1–1,8 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 17.09.2020 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
**Начало торгов – 10.00 15.03.2021 г.**
**Окончание торгов – 12.00 15.03.2021 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 12.03.2021 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Молоко», Витебская обл., г. Витебск, 210101, г. Витебск, Бешенковичское шоссе, 48, тел.: 8 (0212) 28-71-27, 26-81-58.

**Лот № 1** Капитальное строение с инв. № 201/С-10310 площадью 168,3 кв. м по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Бычихинский с/с, аг. Бычиха, ул. Советская, 2А/1, наименование – сепараторный пункт, назначение – здание специализированное иного назначения, составные части и принадлежности: водонапорная башня. Капитальное строение с инв. № 201/С-10311 площадью 4,6 кв. м по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Бычихинский с/с, аг. Бычиха, ул. Советская 2а, наименование – павильон артезианской скважины, назначение – здание специализированное иного назначения. Объекты находятся на земельном участке с кадастровым № 221880902601000001 площадью 0,2963 га по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Бычихинский с/с, аг. Бычиха, ул. Советская, 2А, назначение – земельный участок для использования под сепараторное отделение (право постоянного пользования).

**Нач. цена**: 15 197,36 бел. руб. без учета НДС.

**Задаток:** 1 519,73 бел. руб.

**Дата, время и место проведения торгов**: **26.03.2021 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 23.02.2021 с 08.30 по 25.03.2021 до 17.30. **Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566**. **Условия аукциона:** победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение объекта торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 3 (трех) календарных дней со дня проведения аукциона перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам торгов документации, необходимой для его проведения, на р/с, указанный в протоколе аукциона; заключить договор купли-продажи в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона; оплатить объект в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплатить НДС сверх цены продажи объекта. Аукцион проводится в порядке, установленном Указом Президента Республики Беларусь № 232 от 05.05.2009 г. «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» и Положением «О порядке организации и проведении торгов по реализации имущества ОАО «Молоко» г. Витебск» от 18.02.2021. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (29) 566-83-02 Григорьева Ольга Васильевна.

## ОАО «Минскгрузавтотранс»

**извещает своих акционеров о проведении 26 марта 2021 года очередного (годового) общего собрания акционеров**

**Повестка дня.**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2020 году и основных направлениях деятельности Общества на 2021 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета Общества в отчетном периоде.
3. О результатах проверки аудитором и ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2020 году.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества за 2020 год.
5. О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов за 2020 год, утверждение направлений использования чистой прибыли на 2021 год.
6. Установление размера материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии, избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. О перечислении части прибыли в инвестиционный фонд Министерства транспорта и коммуникаций Республики Беларусь.

**Собрание состоится по адресу:**
**г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2 (2-й этаж, к. 11).**
**Начало собрания – в 15.00.**

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2, комн. 11) в рабочие дни в период с 05 по 26 марта 2021 года с 08.30 до 13.30, а в день проведения собрания – в помещении, где оно проводится.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 14.00 до 14.45 день и по месту проведения собрания – по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а для представителя акционера – также и по доверенности или на основании договора.

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на 01 марта 2021 года.

Справки по тел.: (8-017) 222-98-24, 226-24-27.

***Наблюдательный совет ОАО «Минскгрузавтотранс».***

УНН 100028545

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, находящегося в собственности Республики Беларусь, переданного ОАО «СОЛИГОРСКВОДСТРОЙ» (Продавец) по договору безвозмездного пользования имуществом

**Лот № 1: Жилой дом, 2-й эт.,** инв. № 644/С-53522, 119,4 кв. м: Минская обл., Солигорский р-н, Октябрьский с/с, д. Салогощ, ул. Молодёжная, 1. Земельный участок с кадастровым номером 625083012601000024, 0,0754 га. Право аренды.

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. **Начальная цена без НДС** – 7 343,27 руб.

**Аукцион состоится 26.03.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.** Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by** и Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в дер. Лужки, ул. Подгорная (объект 6/2019), дер. Прилепская Усяжка (объект 169/2017), дер. Малое Залужье, ул. Центральная (объект 10/2020), дер. Рудня, участок № 2 (объект 156/2016) Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области**

***Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет, 222215, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район, Минская область***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Дер. Лужки, ул. Подгорная | 624883005601000186 | 0,1153 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 20 000 |
| 2 | Дер. Прилепская Усяжка | 624883008201000127 | 0,0814 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 12 000 |
| 3 | Дер. Малое Залужье, ул. Центральная | 624883006601000150 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 10 000 |
| 4 | Дер. Рудня | 624883008501000103 | 0,1494 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 10 000 |

**Аукцион состоится 30 марта 2021 г. в 15.00 в Озерицко-Слободском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Смолевичский район, Минская область, зал заседаний, тел.: 801776, 68030.**

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by.

УНП 600046563

# КНІГІ — ЧЫТАЮЦЬ

## Падводзім вынікі: што паказала Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш


Фота БелТА.

**Мерапрыемствы XXVIII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу завяршыліся. За чатыры насычаныя дні адбылося мноства падзей, ахапіць усё немагчыма. Паспрабуем проста паразважаць, якія тэндэнцыі ў кнігавыдавецкай справе і на кніжным рынку выявіў гэты форум, і назваць асноўныя яго вынікі.**

### НОН-ФІКШН І ДЗІЦЯЧЫ ІНТЭРАКТЫЎ

Якія ж жанры цікавяць і чытачоў, і пісьменнікаў?

Канешне, гэта нон-фікшн — кірунак у літаратуры, які з кожным годам набывае ўсё большую папулярнасць. У жанры дакументальнай прозы піша, напрыклад, Інеса Плескачэўская, чые кнігі «Без «жалезнай заслоны» і «Як разгадаць Кітай», выдадзеныя «Звяздой», шырока прэзентаваліся.

Дзіцячая літаратура ніколі не страчвала сваю папулярнасць. Асабліва цяпер, калі назіраецца тэндэнцыя да ўсё больш шчыльнага супрацоўніцтва пісьменніка з мастаком. Нават калі вы лічыце сябе дарослым і сур'ёзным чалавекам, пагартайце кнігу выдавецтва «Папуры» «Калі мне хочацца маўчаць» — манахромныя алоўкавыя малюнкі і сціслыя фразы раскажуць куды больш, чым некаторыя шматтомныя творы. Прэзентацыі для дзяцей часта праходзілі ў інтэрактыўным фармаце. Так, Кацярына Хадасевіч-Лісавая, аўтарка кнігі «Загадкі прынцэсы Агнесы» (таксама выйшла ў нашым Выдавецкім доме), распавядала аб сваіх героях у касцюме шахматнай фігуры.

Папулярныя і мастацкія альбомы. Напрыклад, цікавая серыя «Славутыя мастакі з Беларусі» выдавецтва «Беларусь».

Яшчэ адна тэндэнцыя — актывізацыя перакладаў на беларускую мову, прычым не толькі класічных, але і сучасных твораў. Згадаем хоць бы раман польскага пісьменніка Антонія Ліберы «Мадам», які выйшаў у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў перакладзе Марыны Шоды.

Ва ўсім свеце павялічваецца попыт на электронную кнігу, і беларускія выдаўцы плануюць пашырыць іх продажы.

### ВЫДАЎЦЫ ШУКАЮЦЬ АЎТАРАЎ

Але перш чым прадаць кнігу, трэба яе напісаць і выдаць. У межах кніжнага форуму падвялі вынікі літаратурнага стартапа «ЛітUP», на які сёлета было даслана больш як дзвесце заявак. Фінал праходзіў у форме пітчынгу: аўтары сцісла прэзентавалі праекты, спрабуючы за сем хвілін «прадаць» сваю ідэю выдаўцам. І ў некаторых гэта атрымалася. Так, выдавецтва «Беларусь» абрала праект Кацярыны Залескай «Zuzockaby». Гэта серыя ілюстраваных кніг, у якіх дзяўчынка Зузачка дамагае маленькім дзеткам пазнаёміцца з навакольным асяроддзем. Выдавецтва «Народная асвета» зацікавілася 19-гадовай аўтаркай Дар'яй Нейжмах, якая прадставіла кнігу для падлеткаў «Якога колеру снег?» пра страх адзіноты і ўнікальнасць кожнага з нас. «Мастацкай літаратурай» быў абраны праект Людмілы Адзінцовай «Мая комплексная сястра» — фэнтэзійная казка для дзяцей 8—12 гадоў, аматараў цудаў і матэматыкі. Кнігі адразу двух аўтараў надрукуе выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя». Першы праект сумесны: супрацоўнікі лабараторы тэрыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук створаць энцыклапедыю аб млекакормячых. Ідэя другога праекта — «Я буду ратавальнікам» — належыць Іне Зарэцкай: ён аб прафілактыцы няшчасных выпадкаў з дзецьмі.

Арганізатары не забыліся аб Тыдні роднай мовы. Кампазітар Яўген Ксяневіч прэзентаваў зборнік песень на вершы беларускіх паэтаў «Скарб дарагі». У аснову кнігі ляглі публікацыі ў газеце «Звязда»

### НЕ ТОЛЬКІ МУДРАСЦЬ, АЛЕ І ПРЫГАЖОСЦЬ

На выстаўцы падвялі вынікі конкурсу «Мастацтва кнігі», які праводзіцца ўжо ў шасцідзясяты раз. Гран-пры — у выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» за кнігу-альбом «Храм-помнік зямлі беларускай». Выдавецкі дом «Звязда» атрымаў дыплом пераможцы ў намінацыі «Беларусь памятае» адразу за два выданні: «75 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне» і «Блакада. Блокада. Blockade» Уладзіміра Ліхадзедава. А вось найлепшым у намінацыі «За ўклад у захаванне гісторыка-культурнай спадчыны» аказалася выдавецтва «Беларусь»: у яго і дыплом пераможцы за альбом «Напалеон Орда», і дыплом ІІ ступені за альбом «Вітольд Бяльніцкі-Біруля». У выдавецтва «Мастацкая літаратура» атрымалася стварыць найлепшую серыю дзіцячых кніг «Дванаццаць месяцаў. Чытанка на кожны дзень».

Канешне ж, ва ўмовах пандэміі не ва ўсіх жадаючых атрымалася наведаць выстаўку, але тых, хто прыйшоў, дастаткова, каб засведчыць: цікавасць да кнігі не знікае.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Размова па сутнасці

# СЁННЯ ГОЛАС ПІСЬМЕННІКА Ў НАЙВЫШЭЙШАЙ СТУПЕНІ ВАЖНЫ

## Якія выклікі падкідае час сучасным творцам

**VII Міжнародны сімпозіум літаратараў "Пісьменнік і час" стаў знакавай падзеяй XXVIII Міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Форум сабраў каля сотні літаратараў, выдаўцоў, вядомых грамадскіх дзеячаў з 20 краін свету: Венесуэлы, Азербайджана, Балгарыі, Казахстана, Расіі, Беларусі, Літвы, Украіны, Арменіі, Малдовы, Кыргызстана, Туркменістана... У няпростай эпідэмічнай сітуацыі павялічыць колькасць удзельнікаў удалося дзякуючы спалучэнню двух фарматаў — афлайн і анлайн.**

**Агульныя задачы літаратурнай дзейнасці, новыя выклікі часу і перашкоды, якія стаяць перад пісьменнікамі, неабходнасць узаемадзеяння ў агульнай творчай прасторы, палітычныя і інфармацыйныя ўмовы, у якіх даводзіцца змагацца за чытача, — гэта далёка не ўсе тэмы, што закранулі ўдзельнікі прадстаўнічай сустрэчы.**


Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

На сімпозіуме выяўляліся тыя праблемы, з якімі сутыкнулася сучаснае грамадства. Удзельнікі не проста дзяліліся сваім бачаннем сітуацыі, але і прапаноўвалі рашэнні дзеля таго, каб захаваць мір, наладзіць парушаныя сувязі, забяспечыць працяг культурнага развіцця наступных пакаленняў.

**Спецпрадстаўнік прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл ШВЫДКОЙ** заўважыў, што літаратура заўсёды адлюстроўвае разнастайныя працэсы, якія адбываюцца ў жыцці, і спрабуе гарманізаваць праблемы: «Калі нацыя хоча захавацца ў гісторыі, пераадолець унутраныя супярэчнасці, перажыць складаныя перыяды свайго развіцця, яна звяртаецца да мовы як да выратавання, да літаратуры як да вялікай прасторы міру. Мы жывём у вельмі складаны час. Свет перажывае бурныя, часам драматычныя працэсы, і сёння голас пісьменніка ў найвышэйшай ступені важны. Ён неабходны ўсім, нават людзям, якія не чытаюць кніг. На пісьменніку ляжыць вялікая адказнасць: слова можа распальваць страсці, а можа прымірыць людзей».

За 30 гадоў, якія мінулі пасля распаду Савецкага Саюза, кожная краіна спрабавала знайсці свой шлях, але вельмі важна тое, што мы разумеем нашу неабходнасць адзін аднаму. Быць можа, як ніколі раней. І менавіта мова мастацтва здольна аб'ядноўваць народы.

**Старшыня секцыі драматургіі Саюза пісьменнікаў Таджыкістана Ато ХАМДАМ** засяродзіў увагу на праблемах, з якімі сутыкаюцца літаратары на шляху да замежнага чытача. Сёння аўтарам трэба клапаціцца не толькі пра напісанне кнігі, яе выданне, але і прыкладаць намаганні для таго, каб данесці інфармацыю пра яе да чытача. І, як упэўнены Ато Хамдам, такія ўнутраныя праблемы вядуць да разрозненасці, аўтары не могуць знаёміцца з набыткамі ў іншых краінах і дзяліцца сваімі творчымі дасягненнямі. Куды прасцей вырашаць агульныя праблемы сумеснымі намаганнямі.

Дарэчы, на Мінскай кніжнай выстаўцы **кіраўнік Аналітычнага цэнтра ЕсооМ, член праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Сяргей МУСІЕНКА** агучыў ідэю аб стварэнні Славянскага кніжнага саюза, які б аб'ядноўваў літаратараў па ўсім свеце. Ініцыятыву падтрымалі ўдзельнікі сімпозіума з Расіі, Беларусі, Эстоніі, Сербіі, Балгарыі, Малдовы.

Менавіта за разнастайнасцю будучыня. Сёння мала проста захоўваць нацыянальныя і гістарычныя асаблівасці, важна заставацца адкрытымі для ўсяго свету, наладжваць творчыя сувязі. І ў гэтым кірунку ўжо вельмі многа зроблена. Напрыклад, з 2016 года ў межах праекта «Terra poetica» маладыя творцы Беларусі, Расіі і Украіны абменьваюцца вопытам, знаёмяцца з творчасцю суседзяў, перакладаюць творы адзін аднаго.

У наш час такі дыялог культур асабліва важны. Паступова да яго далучаюцца пісьменнікі розных краін, а таксама літаратуразнаўцы, выдаўцы, аматары мастацкага слова. Істотным паказчыкам развіцця гуманітарнага супрацоўніцтва стаў выхад у свет новага літаратурнага альманаха «Казахстан—Беларусь». Творы нашых пісьменнікаў актыўна перакладаюцца на іншыя мовы, у той жа час беларускія чытачы знаёмяцца з перакладамі найлепшых здабыткаў сучаснай літаратуры краін — удзельніц СНД.

«Наспеў час, каб на змену дыктату сілы, зброі, эмбарга, эканамічных, забароненых спісаў прыйшла дыктатура слова», — упэўнены **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ.** Калі свет узрушваюць бунты, непадпарадкаванне, непавага да законаў, роля пісьменнікаў значна вырастае, яны павінны разважаць над тым, як дапамагчы сваёй краіне. І істотнага эфекту можна дасягнуць, калі аб'яднаць намаганні.

Удзельнікі сімпозіума ўпэўнены, што ў мастацкіх творах павінны закладацца гуманістычныя ідэі дабра, сумлення, адзінства, сяброўства, павагі да нацыянальных культур, моў і веравызнання. Слова не траціць актуальнасці ў справе захавання духоўна-маральных асноў, неабходных для развіцця грамадства.

А яшчэ пісьменнікі павінны несці адказнасць за тое слова, праз якое адкрываюць свой уласны свет і ўсю светабудову. «Каму мы будзем больш давяраць: гісторыку ці пісьменніку? — запытаў **вядомы ўкраінскі паэт Дзмітрый БУРЫГА.** — Вайну 1812 года мы вывучаем паводле Льва Талстога. Ён многае няправільна разумеў, нейкія дыспазіцыі не так намаляваў, але яму мы верым больш. Мы амаль не чуем музыкі Сальеры, хоць гэта быў адзін з найвялікшых кампазітараў свайго часу. Для нас ён у маральным чорным спісе пад загалоўкам «геній і злачынства», хоць ужо практычна даказана, што насамрэч ён не быў злодзеем, гэта быў ці не адзіны чалавек, які разумеў і прымаў Моцарта і падтрымліваў яго несуцішную натуру. І тым не менш літаратурны міф аказваецца мацнейшы за тую рэальнасць, якая некалі адбывалася».

«Мы даверылі лічбаваму свету самае галоўнае — свае бібліятэкі. Мы жывём у лысых кватэрах. Калі дзіця прачынаецца, ці яно бачыць карашкі кніг? Мы страчваем адчуванне рытмаў, тыя самыя песні і рытмічныя казкі з дзяцінства мы ўжо не спяваем і не расказваем нашым дзецям. Мы ўключаем ім мульцік. Яны занятыя, чуюць кастрыраваную мову, чужую перакладную гаворку. У школах адмаўляемся ад паэзіі. Каб дзяцей не траўміраваць, ім перасталі задаваць вучыць вершы на памяць», — б'е ў званы пісьменнік. Таму сёння, на яго думку, трэба бегчы ў садкі і школы і ратаваць дзяцей.

У савецкія часы выходзіла неверагодная колькасць раманаў, і яны выдаваліся неверагоднымі тыражамі, адлюстроўвалі дух эпохі. А сёння гэтага няма. «Што наогул застаецца ад часу, на выклік якога пісьменнік абавязаны адказваць?» — задаўся пытаннем **расійскі журналіст і грамадскі дзеяч Максім ШАЎЧЭНКА.** Сёння мы маем справу з сацыяльнымі сеткамі, нават працэс пісьменніцкай творчасці стаў даступны анлайн. Напрыклад, праз інтэрнэт можна сачыць, як пэўны аўтар працуе над кнігай, чытаць яго чарнавікі.

«Каб зразумець, як нам рэагаваць на выклікі часу, трэба гэтыя выклікі сфармуляваць. Я мяркую, што для кожнага пісьменніка гэтыя выклікі свае. Кожны мастак чуе час па-рознаму і па-свойму на яго адказвае, — упэўнены Максім Шаўчэнка. — Хачу пажадаць кожнаму паэту ці празаіку, майстру малых формаў унутранай свабоды і сумлення. Таму што ў канцы адказваць нам давядзецца не перад парткамамі, міністэрствамі і нават не перад чытачамі, а перад самімі сабой».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

На слыху

# «ПАЛІКЛІНІКІ ЎЖО ВЯДУЦЬ ЗАПІС АХВОТНЫХ»

## Эпідэміёлаг пра тое, ці трэба прышчапляцца ад COVID-19

**У Беларусі вядзецца вакцынацыя супраць каранавіруснай інфекцыі. На распаўсюджаныя пытанні, якія хвалююць многіх, адказала ўрач-эпідэміёлаг, загадчык аддзялення імунапрафілактыкі аддзела эпідэміялогіі Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Марына КАЧКАН.**

**— Ці апраўдана вакцынацыя супраць COVID-19? Наколькі гэта эфектыўная мера?**

— Прайшоў ужо год з таго часу, як чалавецтва сутыкнулася з каранавіруснай інфекцыяй, выкліканай штамам SARS-CoV-2, названай пасля COVID-19. Але ні адна краіна ў свеце не змагла цалкам вырашыць праблему імклівага распаўсюджвання гэтага захворвання — ні шляхам дыстанцыравання і ізаляцыі людзей, ні індывідуальнымі прафілактычнымі мерамі, ні якім-небудзь іншым спосабам. Застаецца надзея на вакцынапрафілактыку.

Сумнявацца ў эфектыўнасці вакцынацыі не варта. Прафілактычныя прышчэпкі даўно ўжываюцца ў барацьбе з інфекцыйнымі захворваннямі. Дзякуючы вакцынацыі ва ўсім свеце ліквідавана натуральная воспа. Захваральнасць на іншых інфекцыях у дзясяткі разоў знізілася альбо таксама ліквідаваная на пэўных тэрыторыях.

Варта таксама сказаць, што пакуль у Беларусі не адзначаецца рост захваральнасці на грып, а па выніках дазорнага нагляду вірусы грыпу сярод хворых на вострыя рэспіраторныя інфекцыі не зафіксаваны.

У гэтым адназначна адыграла сваю ролю вакцынацыя супраць грыпу. Нагадаю, што за апошнія 16 гадоў у Мінскай вобласці назіраецца выразная тэндэнцыя да зніжэння захваральнасці насельніцтва на грып. Для параўнання: у 2005 годзе ахоп прышчэпкамі супраць грыпу ў Мінскай вобласці склаў 6,2 %, захваральнасць на грып — 3 710,1 выпадка на 100 тысяч насельніцтва. У 2020 годзе пры ахопе прышчэпкамі 40,8 % насельніцтва захваральнасць на грып склала 2,5 выпадка на 100 тысяч насельніцтва.

**— Хто ўжо цяпер можа прышчапіцца супраць каранавіруснай інфекцыі?**

— У цяперашні час у Беларусі ў Дзяржаўным рэестры лекавых сродкаў зарэгістравана і ўжываецца вакцына Гам-КОВІД-Вак (камбінаваная вектарная вакцына для прафілактыкі каранавіруснай інфекцыі) вытворчасці Расійскай Федэрацыі пад гандлёвай маркай «Спадарожнік V». Згодна з «Агульнай характарыстыкай лекавага сродку», яна прымяняецца для прафілактыкі COVID-19 у дарослых, старэйшых за 18 гадоў.




У сувязі з абмежаванымі магчымасцямі адначасовай пастаўкі неабходнай колькасці вакцыны Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь вызначаны групы рызыкі, якія падлягаюць першачарговай вакцынацыі. Гэта работнікі арганізацый аховы здароўя, адукацыі і сацыяльных устаноў з кругласутачным знаходжаннем для дзяцей і дарослых.

Па меры паступлення вакцыны будуць прышчапляцца пэўныя кантынгенты, якія маюць рызыку цяжкага ходу захворвання і больш высокую рызыку заражэння інфекцыяй COVID-19 у параўнанні з астатнім насельніцтвам у сувязі з іх прафесійнай дзейнасцю.

Масавая вакцынацыя насельніцтва плануецца з другога квартала 2021 года.

**— Каму трэба паведаміць пра сваё жаданне прышчапіцца?**

— Паліклінікі ўжо вядуць запіс ахвотных прышчапіцца супраць інфекцыі COVID-19. Таму трэба звярнуцца ў амбулаторна-паліклінічную арганізацыю па месцы жыхарства (на тэрапеўтычны ўчастак паліклінікі, ва ўрачэбную амбулаторыю, ва ўчастковую бальніцу, фельчарска-акушэрскі пункт) для ўключэння вас і членаў вашай сям'і ў спісы на вакцынацыю супраць інфекцыі COVID-19.

**Алена КРАВЕЦ.**

**У тэму**

З Кітая ў Беларусь накіравана 100 тысяч доз вакцыны супраць каранавіруса. Кітайскі бок на бязвыплатнай аснове прадставіў Беларусі вакцыну новага тыпу вытворчасці карпарацыі «Сінафарм». Дастаўка вакцыны ажыццяўляецца авіякампаніяй Air China на бязвыплатнай аснове.

Вакцына вытворчасці «Сінафарм» з'яўляецца першай, якая была адобрана ў Кітаі для выхаду на рынак і ўжо актыўна ўжываецца ўнутры краіны. Паводле ацэнак кітайскага боку, вакцына ад COVID-19, распрацаваная кітайскай кампаніяй «Сінафарм», у ходзе выпрабаванняў паказала 79,34 % эфектыўнасці. На сёння, акрамя Кітая, вакцына адобрана для выкарыстання больш чым у 10 краінах свету: ААЭ, Бахрэйне, Егіпце, Іарданіі, Іраку, Сербіі, Марока, Венгрыі, Пакістане і іншых.

# НЕ АБАРАНЯЮЦЬ ЗДАРОЎЕ

## Дзяржстандарт выявіў парушэнні ў сродках індывідуальнай аховы

**У поле зроку інспекцый Дзяржстандарта патрапілі сродкі індывідуальнай аховы. Вырабы, прамое прызначэнне якіх — абараняць жыццё і здароўе чалавека ад шкодных і небяспечных фактараў вытворчага працэсу.**

А што ж на самай справе?

Падчас наглядных мерапрыемстваў за апошнія два гады было праверана 987 найменняў прадукцыі, якая выклікала падазрэнні ў інспектараў. Гэта спецыяльныя рукавіцы, пальчаткі, адзенне, сігнальныя камізэлькі, ахоўныя каскі і шчыткі, стропы. Іх правяралі на адпаведнасць патрабаванням, устаноўленым у тэхнічным рэгламенце Мытнага саюза «Аб бяспецы сродкаў індывідуальнай аховы» (ТР МС 019/2011). Як вынік, парушэнні былі ўстаноўлены больш чым у 97 % праверанай прадукцыі.

У топе парушэнняў — маркіроўка.

— Мала таго што яна была няпоўная: адсутнічала інфармацыя аб вытворцы, ахоўных уласцівасцях прадукцыі, даце яе вырабу, яшчэ прыведзеная інфармацыя нярэдка ўводзіла ў зман спажыўцоў, — у ахоўным асабістым шчытку зваршчыка святлафільтр для зваркі быў выраблены з палімернага матэрыялу, у той час як у інструкцыі заяўлялася сілікатнае шкло, — расказвае **намеснік начальніка Брэсцкай абласной інспекцыі Дзяржстандарта Сяргей ШЧАРБАКОЎ.**

Таксама адсутнічалі дакументы аб пацвярджэнні адпаведнасці патрабаванням тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза і выяўляліся парушэнні патрабаванняў бяспекі. Так, на каркасах палімерных рэспіратараў, якія кантактуюць з тварам, меліся вострыя выступы. Стропы не вытрымлівалі статычнай нагрузкі.

У сігнальных камізэльках не выконвалася яркасць фонавага матэрыялу: пры норме не менш за 0,76 паказчык склаў усяго толькі 0,49. Невыкананне гэтага паказчыка стварае пагрозу для жыцця чалавека пры выкананні ім, напрыклад, рамонтных работ.

А вось у ахоўных касках бакавая дэфармацыя замест належных не больш як 40 мм склала 73 мм, а астаткавая замест не больш як 15 мм — 33 мм. Такія парушэнні стваралі рызыку для жыцця і здароўя чалавека.

Пальчаткі для аховы рук не былі ўстойлівыя да праколу, парэзу і сцірання. Напрыклад, пальчаткі з латэксным пакрыццём не прайшлі выпрабаванні па сціранні. Так, паказчык склаў 170 цыклаў пры норме не менш за 1600 цыклаў — гэта амаль у дзесяць разоў менш за норму!

У іншых пальчатках паказчыкі «ўстойлівасць да праколу», «устойлівасць да парэзу» былі ўдвая менш за норму.

**Начальнік сектара фізіка-механічных выпрабаванняў Цэнтра выпрабаванняў і сертыфікацыі ТААТ Вольга ВАРОНА** (*на фота*) адзначае: «Для таго, каб выпрабаваць пальчаткі для аховы ад сцірання, неабходна выразаць узоры з далоневай часткі пальчаткі і заправіць іх у спецыяльны прыбор. Сціранне выконваецца наждачнай паперай да ўтварэння дзіркі, пры гэтым фіксуецца колькасць цыклаў. Напрыклад, пальчаткі з натуральнай скуры павінны вытрымаць не менш як 7000 цыклаў уздзеяння».

— Калі казаць аб правільным выбары пальчатак для аховы рук, то тут той выпадак, калі на прыгажосць звяртаць увагі не варта. Калі мы гаворым пра пальчаткі, то тут, перш за ўсё, важны іх ахоўныя ўласцівасці, эрганамічнасць і зручнасць у рабоце, паколькі ў гэтых пальчатках мы будзем выконваць пэўную функцыю, — адзначае **дырэктар Цэнтра выпрабаванняў і сертыфікацыі ТААТ Надзея БУДЗЬКО.** — У першую чаргу спажыўцу варта звярнуць



увагу на маркіроўку прадукцыі ў частцы абазначэння ахоўных уласцівасцяў. Маркіроўка павінна быць разборлівай, лёгкачытальнай. Ахоўныя ўласцівасці могуць паказвацца ў назве прадукцыі і суправаджацца адпаведнай піктаграмай або літарным абазначэннем. Напрыклад: «Пальчаткі для аховы рук ад механічных уздзеянняў (пракол)», наносіцца «малаток» ці літары Мп. Калі на пальчатках пазначаны толькі піктаграмы або літарныя абазначэнні, то яны павінны расшыфроўвацца. Такім чынам вытворца або імпарцёр пацвярджае і гарантуе ахоўныя ўласцівасці гэтых пальчатак. Таксама абавязкова пры куплі пальчатак пытаць і дакументы аб пацвярджэнні адпаведнасці (сертыфікат або дэкларацыю на адпаведнасць патрабаванням ТР МС 019/2011).

Пры куплі таксама можна выкарыстоўваць звесткі з інфармацыйнага рэсурсу «Небяспечная прадукцыя» і Тэлеграм-канала Дзяржстандарта «Бяспека і якасць» (t.me/gosstandartby).

**Дар'я ГАСЦІЛОВІЧ.**

## Кінуць курыць дапаможа штучны інтэлект

# ВЫРАШАЙ І ДЗЕЙНІЧАЙ

**Сёння ў свеце налічваецца 1,3 мільярда людзей, якія кураць. Многія з іх хочуць кінуць, але ім не хапае неабходнай падтрымкі. Да таго ж у сувязі з пандэміяй многія кансультацыйныя службы, да якіх людзі звычайна звярталіся, былі вымушаны прыпыніць сваю работу.**

Штогод з-за хвароб, звязаных з курэннем, паміраюць 8 мільёнаў чалавек. Такая афіцыйная статыстыка Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ). На фоне пандэміі, якая ўяўляе пагрозу здароўю і жыццю мільёнаў людзей, у СААЗ вырашылі пачаць глабальную кампанію па барацьбе з курэннем.

«Калі курцам патрэбна дадатковая матывацыя для таго, каб адмовіцца ад шкоднай звычкі, пандэмія — яшчэ адна прычына гэта зрабіць», — кажа кіраўнік СААЗ Тэдрас Гебрэесус.

У СААЗ нагадваюць, што людзі, якія ўжываюць тытунёвыя вырабы, схільныя да большай рызыкі рэспіраторных, сардэчна-сасудзістых і анкалагічных захворванняў, на фоне якіх каранавірусная інфекцыя можа працякаць у цяжкай форме.

Кампанія «Вырашай і кідай!» будзе праходзіць на працягу года. У яе рамках эксперты СААЗ прадстаўляць уладам краін рэкамендацыі па ўзмацненні жорсткасці заканадаўчых мер па барацьбе з курэннем, з аднаго боку, і гарантаванні неабходнай падтрымкі насельніцтву — з другога. Спецыялісты СААЗ таксама будуць распаўсюджваць сярод спажыўцоў інфармацыю пра шкоду тытуню і даваць ім парады па адмове ад гэтай звычкі.

Для садзейнічання ў вырашэнні гэтай праблемы СААЗ (у партнёрстве з Soul Machines, Amazon Web Services і Google Cloud) распрацавала робата-медработніцу з штучным інтэлектам з імем Фларэнс. Яна гатовая працягнуць руку дапамогі тым, хто вырашыў адмовіцца ад курэння. Інтэрнэт-кансультант працуе ў рэжыме анлайн і гатовы аказаць неабходную падтрымку жадаючым пераадолець як фізічную, так і псіхалагічную залежнасць ад тытуню.

У Фларэнс заўсёды ёсць час, каб пагаварыць менавіта тады, калі чалавеку асабліва патрэбна дапамога. Віртуальная памочніца запраграмавана на правядзенне некалькіх кароткіх гутарак з кліентам з выкарыстаннем галасавых або тэкставых месенджараў. Яна дапамагае зрабіць першыя крокі на шляху да адмовы ад тытуню, усяляе ў сваіх суразмоўцаў упэўненасць у магчымасці дасягнуць мэты, а затым прапануе індывідуальную стратэгію адмаўлення ад курэння.

Фларэнс знаёміць сваіх пацыентаў з рэкамендаванымі СААЗ праграмамі, з нумарамі бясплатных тэлефонных ліній, якія дапамагаюць адмовіцца ад курэння, з праграмамі і службамі абмену тэкставымі паведамленнямі, даступнымі ў іх краіне.

У адрозненне ад чат-ботаў Фларэнс адразу дае эмацыянальныя адказы ў рэальным часе, яна падбадзёрвае суразмоўцу не толькі словамі, але і мімікай свайго твару. «Дзяўчына» здольная апрацоўваць гукавую, візуальную і тэкставую інфармацыю, якую яна атрымлівае ў ходзе зносін. Пры гэтым даныя, якімі кліенты дзеляцца з робатам, у сістэме не збіраюцца і не захоўваюцца.

Фларэнс размаўляе пакуль толькі па-англійску, але неўзабаве яна «авалодае» таксама арабскай, іспанскай, кітайскай, рускай і французскай мовамі.

Для адмовы ад курэння можна скарыстацца бясплатнымі праграмамі, распрацаванымі для Android і iOS . Так, напрыклад, дадатак Kwit будзе штодня нагадваць аб бягучым прагрэсе: колькі ў крыві засталося нікаціну, колькі грошай сэканомілі і іншае. Дадатак QuitNow! дае стандартную інфармацыю — колькі ў днях, гадзінах і мінутах вы ўжо не курылі. Таксама ў QuitNow! прадугледжаны паказчыкі працэсу паляпшэння здароўя, заснаваныя на даных СААЗ. У дадатку ёсць спіс дасягненняў, дзякуючы якому вы зможаце захоўваць матывацыю.

Па даных СААЗ, 780 мільёнаў чалавек у свеце хочуць кінуць курыць. У Арганізацыі спадзяюцца, што дзякуючы кампаніі «Вырашай і кідай!» перамагчы шкодную звычку зможа каля 100 мільёнаў спажыўцоў тытунёвых вырабаў.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

50+: жыць цікава!

# ДАДАЙЦЕ ПАЗІТЫВУ!

## Як мінская пенсіянерка дапамагае аднагодкам стаць больш шчаслівымі

**Быць маладым ці старым — чалавек вырашае сам, а ўзрост не варта мераць лічбамі ў пашпарце. Гэта філасофія жыцця кіраўніцы клуба індыйскага танца «Пазітыў» для пажылых людзей. І гэта — галоўнае, чаму яна імкнецца навучыць тых, хто прыходзіць займацца ў клуб.**

### Аб праблемах пенсійнага ўзросту

— Свой клуб я назвала «Пазітыў», таму што менавіта пазітыву нашым пенсіянерам і не хапае, — кажа Зоя Сямёнава.

Зоі Аронаўне ў красавіку будзе 70, а яе клубу — ужо 15 гадоў. Выйшаўшы на пенсію, яна спаўна адчула ўсё яе «харастворо». Адчуванне непатрэбнасці, думкі, што жыццё прайшло, што ў сучасным свеце пажылыя людзі незапатрабаваныя, а наперадзе — толькі старасць і хваробы...

— Паглядзіце: у наш час жанчыны, якім і 55, і 60, і 70 гадоў, і нават больш, актыўна бяруць удзел у жыцці, імкнуцца працаваць і добра выглядаць, дапамагаюць сваім дзецям выхоўваць унукаў. А нярэдка пенсіянеры дапамагаюць сем'ям сваіх дзяцей і матэрыяльна. Пажылыя людзі атрымліваюць правы і ўпершыню садзяцца за руль. Хочуць падарожнічаць і пазнаваць новае. Беларускія пенсіянеры ў сваім стаўленні да жыцця вельмі падобныя да пажылых еўрапейцаў. І пры гэтым мы сутыкаемся з тым, што, апынуўшыся на пенсіі, адчуваем сябе нібы выключанымі з жыцця — з-за састарэлых стэрэатыпаў, з прычыны няправільнага стаўлення да нас.

Сіл шмат, а прымяніць сябе часта проста няма куды. Гэта — прычына цяжкага душэўнага стану і дэпрэсій у жанчын, а мужчыны часам проста співаюцца.

Суразмоўніца прызнаецца, што таксама адчувала разгубленасць, выйшаўшы на пенсію. А пасля смерці маці — перажыла дэпрэсію.

— Дачка, убачыўшы мой стан, запрасіла мяне на заняткі індыйскімі танцамі ў клуб «Сапна», дзе займалася сама. І паступова я адчула, што на душы становіцца лягчэй.

Тады пра свой клуб Зоя Аронаўна не думала. Проста танцавала нароўні з маладымі, хоць гэта было і нялёгка. Але аднойчы на рэпетыцыі здарылася сур'ёзная траўма, з прычыны якой яна страціла два суставы.

— Цяпер у мяне стаяць пратэзы суставаў. Але ж па маёй пастаці і хадзе гэтага ніколі не адгадаеш, праўда?

Сапраўды, пастаць у маёй суразмоўніцы каралеўская, а хада такая, якая і павінна быць у танцоркі — лёгкая і пругкая. Пасля аперацый зноў стала танцаваць, але цяпер стараецца больш сцерагчыся ад траўм.

— Прыйшлося падумаць, як зрабіць так, каб не расставацца са сваім захапленнем. І так нарадзілася ідэя клуба для маіх аднагодкаў — каб быць сярод аднадумцаў і займацца любімай справай. Выкладаю індыйскія танцы як валанцёр, мае вучні мне не плацяць. Асноўнае правіла на нашых занятках — не нанесці шкоды здароўю. Галоўнае для нас — не вынік, а задавальненне ад працэсу.



Зоя Сямёнава тры разы была прызнаная адным з найлепшых валанцёраў Мінска.

У дапенсійным жыцці з танцамі прафесія Зоі Сямёнавай звязаная не была — яна ўсё жыццё прапрацавала выхавальнікам у дзіцячым садку. І не проста выхавальнікам. Зоя Аронаўна была педагогам-наватарам. Але пра яе педагагічную тэорыю выхавання шчаслівых і таленавітых дзяцей крыху пазней. Зрэшты, з фітнесам (як цяпер сказалі б) мая суразмоўніца сябравала заўсёды.

— На занятках я выкладаю толькі тое, што выпрабавала на сабе. Шмат гадоў я займалася рытмічнай гімнастыкай, аэробікай і нават ушу. А вось цяпер улюбілася ў індыйскія танцы...

### Аб удзячнасці лёсу

Сёння ў клубе індыйскага танца Зоі Сямёнавай — больш за дзесяць жанчын і адзін мужчына. А галоўная задача, якую ставіць перад сабой выкладчыца, — дапамагаць людзям стаць больш шчаслівымі.

— Карысць ад нашых заняткаў відавочная. Адна з удзельніц клуба, напрыклад, доўгія гады знаходзілася на ўліку ў кардыядыспансеры — праз два гады заняткаў у «Пазітыве» яе знялі з уліку, таму што праблемы з ціскам зніклі. Яшчэ адна наша пенсіянерка села на шпагат — а яна ж ніколі, нават у маладосці, гэтага не магла. Расцяжка, разумная рухальная актыўнасць і правільная кардыянагрузка ўмацоўваюць здароўе і робяць маладзейшым арганізм, а індыйская музыка наогул аднаўляе клеткі. Пачынаюць лепш рухацца суставы, нармалізуецца работа сэрца. Пасля трэніроўкі кожны раз цікаўлюся: «Можа быць, хтосьці стаміўся і хоча прылегчы?» І ў адказ чую, што, наадварот, сіл дадалося і хочацца танцаваць, жыць поўным жыццём, перарабіць усе справы, а не паныла ляжаць перад тэлевізарам. Але галоўнае нават не аздараўленне, а тое, як змяняецца стаўленне да жыцця. Прыходзячы ў клуб, людзі вучацца ўсміхацца. Бо наогул у нас неяк не прынята ўсміхацца. Як і дзякаваць свайму лёсу. Заўсёды ёсць за што падзякаваць яму. Нават калі вам здаецца, што гэта не так, падумайце — і вы знойдзеце нагоды для падзякі.

Танцавальны клуб «Пазітыў» актыўна супрацоўнічае з Чырвоным Крыжам.

— Ездзім выступаць па бальніцах, дыспансерах, у санаторыях, дзіцячых дамах і інтэрнатах для пажылых людзей. Нас заўсёды вельмі добра прымаюць. І просяць прыязджаць яшчэ. Але ведаеце, што цікава? Калі мы куды-небудзь прыязджаем выступаць, першае пытанне ў гледачоў — адкуль мы прыехалі? Я кажу: мы адсюль, з Беларусі, з Мінска. І, зразумела, удакладняю, чаму паўсталі сумненні, што мы «не мясцовыя». І ведаеце, што адказваюць людзі? Што ва ўсіх у нас шчаслівыя вочы і мы шмат усміхаемся.

— Ковіду не баіцеся?

— У нас на ковід ніхто ў калектыве не хварэў, — адказвае Зоя Аронаўна. Яна ўпэўненая: чым часцей чалавек бывае шчаслівы, тым мацнейшы яго імунітэт.

А яшчэ, сцвярджае Зоя Сямёнава, індыйскія танцы дапамагаюць вярнуць маладосць.

— У Індыі жанчына застаецца жаноцкай і ў глыбокай старасці. У нас маладыя дзяўчаты — усе як на падбор фотамадэлі. Але вось дзяўчына выйшла замуж, нарадзіла — і прыгажосці як не было. Не мадэль, а ламавы конь, які ўзваліў на сябе ўсё — работу, дом, мужа і дзяцей, і цягне, надрываецца ўсё жыццё. Калі да нас у клуб прыходзяць новыя ўдзельніцы, спачатку яны нават прайсці па зале прыгожа не могуць — адбіваецца шматгадовая звычка хадзіць з апушчанымі плячыма, гледзячы ў зямлю. Але, на шчасце, гэта можна паправіць! Ведаеце, мне ў краме ці грамадскім транспарце ніколі не кажуць «жанчына», як у нас прынята звяртацца і да пані за 35-40, і да 80-гадовых кабет. Мне кажуць «дамачка», — смяецца Зоя Аронаўна.



Творчы калектыў клуба «Пазітыў».

### Аб марах і забудове гарадоў

Зоя Сямёнаўна сцвярджае, што ўзрост — не перашкода для выканання мары. Пачаўшы вывучаць індыйскія танцы, захацела пабываць у Індыі. За некалькі гадоў здолела сабраць патрэбную суму і праехала з тургрупай больш за тры тысячы кіламетраў па гэтай краіне.

— Індыя мяне ўразіла! — распавядае яна. — Гэтая краіна нібы паказвае кожнаму, які ён на самай справе. Таму ў Індыю здаўна імкнуліся людзі, калі ў іх з'яўлялася неабходнасць разабрацца ў сабе... Там можна ўбачыць толькі бруд і галечу, а можна — прыгажосць і веліч. Пытанне ў тым, што захоча ўбачыць турыст. Індыя — краіна шчаслівых людзей. Вось спіць на зямлі жабрак. Прачынаецца, і перш за ўсё ўсміхаецца сонцу, навакольнаму свету, тым людзям, што аказваюцца побач. Хоць па нашай еўрапейскай логіцы, ледзь прачнуўшыся, ён павінен быў бы пачаць клясці свой лёс. А ён — удзячны жыццю! Мы кажам: проста там больш сонца, вось і ўсмешак больш... Справа не толькі ў гэтым. Справа ў стаўленні да жыцця, якое прынята ў грамадстве. Хоць, вядома, сонца ў нас мала, і гэта, безумоўна, робіць свет шэрым. Таму я заўсёды здзіўляюся, калі бачу, што ў Мінску будуецца чарговы высотны дом. Магчыма, архітэктары са мной паспрачаюцца, яны кіруюцца іншымі меркаваннямі. Але зыходзячы з простай логікі, у нас нельга будаваць высокія дамы. Хмарачосы і ўвогуле высотныя будынкі добрыя для паўднёвых краін, яны даюць цень. А для нашых шырот падыходзіць невысокая забудова — тады зімой у людзей не будзе такога засмучэння.

### Аб педагагічнай тэорыі

Педагогам дашкольнай адукацыі Зоя Аронаўна прапрацавала каля 40 гадоў.

— Маё дзяцінства і юнацтва прайшлі ў 60-я, падчас «адлігі». Сям'я ў нас была творчая: і мама, і бацька працавалі мадэльерамі. Дызайнерамі, як цяпер прынята казаць. Напэўна, яны і заклалі ў сваіх дзяцей такія погляды на выхаванне.

Паводле тэорыі Зоі Аронаўны, галоўная задача выхавацеля — вырасціць са сваіх выхаванцаў шчаслівых людзей. А зрабіць гэта можна, толькі даўшы дзіцяці свабоду.

— Гэта вельмі дрэнна, калі маленькі чалавек усё дзяцінства праводзіць у клетцы забарон, натацый і вокрыкаў дарослых. З нявесткай і сынам мы часта спрачаемся аб выхаванні майго ўнука. Я кажу: што вы тэрарызуеце дзіця? Ян цяпер ужо падлетак, але па-ранейшаму ўсё лета праводзіць у мяне на дачы і кажа, што са мной яму вельмі добра. Пры гэтым мы і вучымся, і дома ён нам з дзедам дапамагае. Лічыцца: калі дзіця не прымушаць, яно не будзе рабіць нічога добрага. Але гэта стэрэатып, памылка дарослых. Навучыць нечаму хутка і эфектыўна можна толькі з дапамогай заахвочвання, пахвалы. А мы прывыклі не заўважаць поспехі дзяцей. Максімум — мімалётнае «добра, малайчына». Але варта дзіцяці здзейсніць промах — усё, вось гэта будзе заўважана! Ды яшчэ як заўважана! Яго будуць доўга лаяць, прыдумаюць якое-небудзь пакаранне. А потым яшчэ некалькі дзён, месяцаў, а то і гадоў будуць успамінаць малому ці падлетку яго памылку. Але мая практыка паказвае: калі акцэнтаваць увагу не на няўдачах, а на поспехах, выхаванне і навучанне дае найлепшыя плады.

Зоя Аронаўна ўспамінае, колькі разоў чула і ад калег, і ад начальства, і ад бацькоў яе выхаванцаў: занадта песціце, захвальваеце, зусім разбэсціце... А па факце дзеці хутка вучыліся, лёгка і трывала засвойвалі веды.

— Столькі гадоў прайшло, а мае выхаванцы мяне памятаюць. Нядаўна на вуліцы падыходзіць прыгожы малады мужчына: «Зоя Аронаўна, вы мяне пазнаяце?». Пазнала я яго не адразу — гэта быў мой выхаванец, з апошняга майго выпуску ў дзіцячым садку, я яго апошні раз шасцігадовым бачыла... Такі хлопец вырас — любата! Я ганаруся ўсімі сваімі выхаванцамі, і заўсёды радуюся, калі даведваюся аб іх поспехах.

### Аб шчасці і надзеях

— Я раіла б пенсіянерам навучыцца не ўзірацца з трывогай у заўтрашні, а тым больш — у паслязаўтрашні дзень, — кажа суразмоўніца. — Давайце вучыцца жыць сённяшнім днём. І яшчэ: не трэба спадзявацца, што вас вылечаць. Як пісалі Ільф і Пятроў, выратаванне тапельцаў — справа рук саміх тапельцаў. Пра тое ж казалі антычныя медыкі: вылечы сябе сам. Гэта магчыма. Першы і галоўны крок на гэтым шляху — жаданне жыць і пазітыўнае стаўленне да жыцця. Сонца выйшла з-за хмар — радуйся сонцу. Няма сонца — дык заўтра ж яно будзе! Гэтаму таксама варта парадавацца.

Зараз клуб «Пазітыў» перажывае нялёгкія часы.

— У нас узніклі праблемы з памяшканнем, — дзеліцца суразмоўніца.

Многія гады клуб працаваў у тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Фрунзенскага раёна Мінска, на вуліцы Харкаўскай — яна знаходзіцца недалёка да цэнтральных магістраляў горада і туды лёгка дабрацца. Цяпер у цэнтра з'явіліся новыя плошчы на вуліцы Люцынскай, каля МКАДа. Дабірацца туды ўдзельнікам клуба цяжка, улічваючы, што гаворка ідзе пра людзей сталага ўзросту, у якіх няма асабістых аўтамабіляў.

— Спачатку нам казалі, што мы, прыходзячы на заняткі, «распаўсюджваем ковід». Але ў нас у калектыве ніхто не хварэў і не хварэе. У зале ўстаноўлены бактэрыцыдныя лямпы, набыты люстэркі, нядаўна заменілі падлогу. І вось, калі ласка — рамонт! Навошта рамантаваць залу, якая ў выдатным стане?

Пенсіянеры спрабавалі займацца танцамі па відэасувязі — але гэта аказалася складана: не ва ўсіх удзельнікаў калектыву ёсць камп'ютары, не ўсе ўмеюць карыстацца месенджарамі, ды і падчас аддаленых заняткаў няма патрэбнай атмасферы. Спрабавалі займацца на вуліцы, на школьным стадыёне — аказалася, для гэтага пакуль занадта холадна.

Але калектыў «Пазітыву» не траціць надзею вярнуцца ў сваю залу. Бо цяжкасці, згодна з жыццёвай філасофіяй Зоі Сямёнавай, — не падстава апусціць рукі і шкадаваць сябе, а нагода дзейнічаць.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»

**(организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении 10 марта 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 75 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА ранее опубликован в газете «Звязда» от 24.10.2020 г. № 208 (29322), www.bankrot.gov.by.**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

**Продавец: ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснёв Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»): р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2) Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 23 февраля 2021 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 5 марта 2021 г. в 16.00 включительно** (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов). Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии **по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом, **в течение 5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи **в течение 5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи **в течение 10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, возместить затраты, связанные с организацией и проведением торгов **в течение 5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129. Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.10.2020 г. № 208(29322). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»

**(организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении 11 марта 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 75 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–9) ранее опубликован в газете «Звязда» от 15.10.2020 г. № 201(29315), www.bankrot.gov.by.**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

**Продавец: ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»): р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2) Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 23 февраля 2021 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 9 марта 2021 г. в 16.00 включительно** (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов). Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но **не позднее чем за 5 (пять) дней** до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом **в течение 5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи **в течение 5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи **в течение 10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, возместить затраты, связанные с организацией и проведением торгов **в течение 5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129. Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 15.10.2020 г. № 201(29315). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8(029)126-66-62.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»

**(организатор аукциона) по поручению ОАО «Речицкий завод «Термопласт» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Олейника П.С. извещает о проведении 26 марта 2021 года открытого аукциона по продаже ДЕБИТОРСКОЙ ЗАДОЛЖЕННОСТИ в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Бобруйское унитарное коммунальное производственное предприятие «Комбинат железобетонных изделий», УНП 700838204 | **6 308,57** | 315,43 | 630,86 |

**Продавец: ОАО «Речицкий завод «Термопласт», ул. Чапаева, 57. 247500, Гомельская область, г. Речица. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (044) 554-10-33 – управляющий в деле о банкротстве Олейник Павел Станиславович. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»): р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 23 февраля 2021 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 24 марта 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Организатором торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов **в течение 5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи **в течение 20 (двадцати)** календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи **в течение 5 (пяти) календарных дней** с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129. Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 21.03.2020 г. № 56 (29170). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029)126-66-62.**

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 11 марта 2021 года

**на 4-ом открытом аукционе проводит 16-й от 1 октября 2020 года, 18-й от 8 октября 2020 года, 19-й от 29.10.2020 года повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности**

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 163 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66 в составе: кузов-фургон К-66 № 60380 1981 г. 4 кат. Автошасси ГАЗ-66 ш. 0230096 дв. 2211558 1981 г. 3 кат. 6830 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 4 100,00 | 820,00 |
| 200 | Специальный автомобиль КамАЗ-43106 с кузовом-фургоном К2-375 в составе: кузов-фургон К2-375 № 010118 1990 г. 4 кат. Автошасси КамАЗ-43106 ш. 004361 дв. 0637218 1990 г. 4 кат. 46685 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 12 000,00 | 2 400,00 |
| 207 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном КУНГ-1М в составе: кузов-фургон КУНГ-1М № б/н-207417 1973 г. 4 кат. Автошасси ГАЗ-66 ш. 4-292518 дв. 227345 1971 г. 4 кат. 8913 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 3 500,00 | 700,00 |
| 208 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: кузов-фургон К-66Н № 14579 1979 г. 4 кат. Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 0408990 дв. 106523 1979 г. 4 кат. 3276 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 3 200,00 | 640,00 |
| 210А | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном ДФ-3 в составе: кузов-фургон ДФ-3 № 3051 1981 г. 4 кат. Автошасси ГАЗ-66 ш. 0215731 дв. 2121292 1981 г. 4 кат. 4212 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 4 200,00 | 840,00 |
| 211 | Грузовой бортовой КрАЗ-255Б1 ш. 630085 дв. 906253 1988 г. 4 кат. 53440 км | г. Береза, в/ч 23324 | 8 000,00 | 1 600,00 |
| 214 | Автошасси Урал-375Д ш. 248443 дв. 460756 1977 г. 4 кат. 9860 км | н. п. Новоколосово, в/ч 25819 | 7 200,00 | 1 440,00 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 11 марта 2021 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 5 марта 2021 года.**

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **11 марта 2021 г. с 9.15 до 10.00.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20012226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС. Справки по тел./факсу (017) 319 35 41.

*Ранее опубликованные извещения в газете «Звязда» № 239 от 8.12.20 г.*

Открытое акционерное общество

## «Дорожно-строительный трест № 3»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Собрание состоится 25 марта 2021 года в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23. Собрание пройдет в смешанной форме. Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 01.03.2021.**

**Повестка дня:**

- О рассмотрении отчета генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности за 2020 год и основных направлениях деятельности Общества в 2021 году.
- О рассмотрении отчета о работе наблюдательного совета Общества за 2020 год.
- О рассмотрении заключения ревизионной комиссии по результатам проведения ревизии финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2020 год и аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2020 год.
- Об утверждении годового отчета, годовой (бухгалтерской) финансовой отчетности Общества и распределении прибыли и убытков Общества за 2020 год с учетом заключения ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
- О принятии решения об объявлении и выплате дивидендов за 2020 год
- Об утверждении направления распределения и использования чистой прибыли Общества на 2021 год.
- Об избрании членов наблюдательного совета.
- Об избрании членов ревизионной комиссии.
- Об определении размера вознаграждений и компенсации расходов членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества за исполнение ими своих обязанностей.
- О внесении изменений в Устав Общества.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 25 марта 2021 года с 12.00 до 12.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с документами к собранию начиная с 01 марта 2021 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

***Справки по телефонам: 28-40-20, 23-64-24 – ОЭАиП, Наблюдательный совет.***

УНП 700049607

# ТРАНЗІТ НА ШМАТКІ

## Чаму Літва заганяе сябе ў эканамічную пастку?

**Міністр транспарту і камунікацый Беларусі Аляксей Аўраменка і міністр транспарту Расіі Віталь Савельеў днямі ў Маскве падпісалі міжурадавае пагадненне, якое напярэдадні ўхваліў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Гэтае пагадненне невыпадкова назвалі гістарычным. Яно датычыцца арганізацыі супрацоўніцтва ў галіне перавозкі і перавалкі беларускіх нафтапрадуктаў, прызначаных на экспарт у трэція краіны, праз расійскія марскія парты, паведаміла БелТА. Дакумент прадугледжвае перавалку беларускімі прадпрыемствамі больш за 9,8 мільёна тон грузаў у расійскіх партах на Балтыцы ў 2021—2023 гадах. У далейшым дзеянне пагаднення можа быць падоўжана. Гаворка ідзе пра такія грузы, як мазут, бензін і масла. Нафтапрадукты вытворчасці беларускіх НПЗ будуць перавозіцца да партоў РФ чыгуначным транспартам. Дакументам вызначаны гранічныя стаўкі на рухомы састаў і паслугі па перавалцы грузаў у марскіх партах Расіі. Адметна, што бакі гарантуюць адсутнасць любога павышэння тарыфаў, за выключэннем штогадовай агульнай індэксацыі. Расійскія партнёры гарантуюць таксама выдзяленне рухомага саставу для перавозкі беларускіх нафтапрадуктаў. Чаму змянілася беларуская лагістыка?**



### НА АГУЛЬНУЮ КАРЫСЦЬ

Актыўна абмяркоўваць пытанне «абнулення» балтыйскіх партоў і перавод асноўнай часткі экспартных грузаў у марскія тэрміналы Расіі пачалі яшчэ паўгода таму. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з работнікамі ТАА «Савушкін-Орша» ў жніўні мінулага года паабяцаў адказ беларускага боку на ўвядзенне санкцыйных мер з боку шэрагу краін. «Я даручыў ураду ўнесці прапанову аб пераарыентацыі ўсіх гандлёвых патокаў з партоў Літвы на іншыя. Вось мы і паглядзім, як яны будуць жыць. 30 працэнтаў літоўскага бюджэту фарміруюць нашы грузапатокі праз Літву. Што яшчэ трэба? Зажраліся. Таму паставім на месца», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь ужо праходзіла перыяд санкцый. «Выжылі. Выжывем і цяпер. Свет не без добрых людзей. Таму нас палохаць не трэба», — сказаў ён.

Эксперты лічаць, што Літва насамрэч стала слабым звяном на шляху беларускага транзіту. «Немагчыма зразумець літоўскую логіку, таму што гэтай логікі няма. Сур'ёзны бізнес не можа быць паспяховым у непрадказальных умовах з непрадказальным партнёрам. Літва — гэта непрадказальны партнёр», — растлумачыў 1tv.ru кіраўнік Цэнтра беларускіх даследаванняў Інстытута Еўропы РАН Мікалай Мяжэвіч.

Беларускі лідар слоў на вецер не кідае. Яшчэ адно пацвярджэнне гэтаму — міжурадавае пагадненне па перавалцы нашай прадукцыі праз расійскія парты. Прычым (што важна) без эканамічных страт для айчынных вытворцаў. Кіраўнік беларускага Мінтранса паведаміў, што вялася шчыльная работа па выхадзе на падпісанне неабходных кантрактаў з грузааператарамі. «Я вельмі рады, што нам удалося дамовіцца і адначасова плануецца падпісанне адпаведных камерцыйных кантрактаў», — адзначыў Аляксей Аўраменка. Як удакладнілі ў расійскім Мінтрансе, падпісаны неабходныя кантракты паміж беларускімі і расійскімі суб'ектамі гаспадарання. «Пагадненне адкрывае новыя магчымасці па адкрыцці альтэрнатыўнага маршруту пастаўкі нафтапрадуктаў на экспарт», — рэзюмаваў Аляксей Аўраменка.

Гістарычнай падзеяй назваў падпісанне пагаднення міністр транспарту Расіі Віталь Савельеў. Паводле яго слоў, цана на паслугі для беларускіх пастаўшчыкоў у расійскіх партах ніжэй, чым яна была пры перавалцы праз парты краін Балтыі. «Усе расійскія гаспадарчыя суб'екты пайшлі на істотныя зніжкі зыходзячы з аб'ёмаў, прапанаваных беларускім бокам», — адзначыў кіраўнік Мінтранса Расіі. «Мы лічым, што гэтае пагадненне было падпісана да задавальнення абодвух бакоў і яно дасць карысць і Расіі, і Беларусі», — падсумаваў Віталь Савельеў.

### ПЕРАВАЛКА ПАЧНЕЦЦА Ў САКАВІКУ

«Гэта будзе наша добрае партнёрскае ўзаемадзеянне. Узаемная дапамога, — заўважыў губернатар Ленінградскай вобласці Аляксандр Драздзенка, паведаміла tvr.by. — Мы будзем рады эканамічна. Гэта дадатковыя грузы, гэта развіццё нашай эканомікі, у тым ліку нашых партовых магутнасцяў. Гэта павелічэнне тавараабароту паміж нашымі краінамі, што таксама адаб'ецца ў плюс. Ёсць тэрміналы, якія гатовыя працаваць ужо заўтра, ёсць тыя, якія будуюцца і гатовыя працаваць паслязаўтра».

Пагадненне аб перавалцы беларускіх нафтапрадуктаў заключана па формуле take-or-pay, нашых экспарцёраў не прывязваюць да колькасці, але чым больш яны перавязуць, тым танней гэта будзе, паведаміла ont.by. Чакаецца, што першыя беларускія знешнегандлёвыя грузы будуць перавезены праз расійскія марскія парты ўжо ў сакавіку.

Асноўным стане порт Усць-Луга. На сённяшні дзень гэта адна з самых сучасных пляцовак у Расіі. Гэта ўніверсальны транспартны аб'ект, які аказвае паслугі па перавалцы больш як 20 відаў грузаў. Па федэральнай праграме развіцця марскіх партоў ужо да 2024 года Усць-Луга павінна стаць найбуйнейшым транспартным хабам на Балтыцы.



### У ПЕРСПЕКТЫВЕ — ЛЕС І КАЛІЙ

Беларусь гатова абмяркоўваць пераарыентацыю перавалкі экспартных паставак калійных угнаенняў праз расійскія парты. Пра гэта заявіў міністр транспарту і камунікацый Беларусі Аляксей Аўраменка, паведаміла БелТА. «Мы абкатаем гэтыя маршруты на прыкладзе нафтапрадуктаў, і ў далейшай перспектыве мы гатовыя абмяркоўваць з нашымі калегамі згаданыя пытанні. Гэта не толькі калійныя ўгнаенні, але і лясныя грузы, грузы машынабудаўнічага комплексу і г. д.», — сказаў Аляксей Аўраменка.

«Гэтае пытанне патрабуе больш глыбокай дэталёвай прапрацоўкі з пункту гледжання магутнасцяў, партовай інфраструктуры», — дадаў ён. Гатоўнасць расійскага боку разгледзець магчымасць перавалкі беларускіх калійных угнаенняў і іншых грузаў праз парты Санкт-Пецярбурга і Ленінградскай вобласці пацвердзіў міністр транспарту РФ Віталь Савельеў. «Мы працягнем работу па іншых прадуктах, што вырабляюцца ў Беларусі», — адзначыў ён.

Дарэчы, як паведаміў rubaltic.ru, ва Усць-Лузе ўвялі ў эксплуатацыю тэрмінал па перавалцы мінеральных угнаенняў. Выхад на поўную магутнасць у 12 мільёнаў тон запланаваны на канец 2021 года.

### НЯМА ПЕРСПЕКТЫВЫ

Мінск забяспечваў 30 працэнтаў грузаабароту Клайпедскага порта, сярод насыпных грузаў доля беларускай прадукцыі дасягае амаль 100 % дзякуючы «Беларуськалію», паведаміла iz.ru. Толькі ў 2019 годзе праз Клайпеду прайшло 15,5 мільёна тон беларускіх грузаў, з іх 9,8 млн тон калійных угнаенняў. У тым ліку дзякуючы гэтаму Клайпедскі порт забяспечвае 6-7 % ВУП Літвы і дае работу 58 тысячам чалавек (траціна насельніцтва Клайпеды). Толькі за 9 месяцаў мінулага года літоўскі бок атрымаў за перавалку беларускіх нафтапрадуктаў 23,7 мільёна еўра. Сёлета яны ўжо дакладна гэтых грошай не ўбачаць.

Эксперт Фонду нацыянальнай энергетычнай бяспекі, выкладчык Фінансавага ўніверсітэта пры ўрадзе РФ Станіслаў Мітраховіч падкрэсліў парталу Baltnews, што Клайпедскі порт разам з Вентспілскім свабодным портам у Латвіі з'яўляецца найбуйнейшым у Прыбалтыцы і страта беларускага транзіту будзе вельмі адчувальная.

«Зрабіць Клайпедскі порт канкурэнтаздольным без беларускай прадукцыі для прыбалтыйскіх краін будзе даволі складана. Асабліва калі ўспомніць, што яшчэ і чыгунка Літвы шмат у чым зарабляе грошы за кошт транспарціроўкі тавараў з Беларусі, у тым ліку насыпных грузаў», — адзначыў эксперт.

Клайпедскі порт чакае крах, таму што інвестары адмовяцца ад буйных капіталаўкладанняў у яго інфраструктуру пасля перакідання беларускіх грузаў у Расію, лічыць кіраўнік Цэнтра палітэканамічных даследаванняў Інстытута новага грамадства Васіль Калташоў. «Асноўнай ідэяй камерцыйнага планавання з'яўляецца ўлік перспектывы, і гэтая перспектыва для Літвы вельмі няспрыяльная. З такімі наступствамі ад дзеянняў літоўскіх дзяржаўных дам і мужоў Клайпедскі порт асуджаны. Няма ў яго ніякай перспектывы, таму што са стратай беларускага транзіту ён губляе ўсё, а расійскага транзіту там таксама не будзе», — дадаў эканаміст.

Эксперт падкрэсліў, што без інвестыцый у структуру порта даходы літоўскага бюджэту значна скароцяцца, а гэта негатыўна адаб'ецца на эканоміцы краіны ў цэлым. «З пункту гледжання інвестараў, гэта азначае, што любыя капіталаўкладанні, якія будуць рабіцца ў літоўскую эканоміку ці якія ўжо зробленыя, павінны быць адкарэктаваныя, зыходзячы з таго, што рынак будзе сціскацца», — сказаў ён.

«Літва недаатрымае значныя сумы транзітнай выгады. У выніку ўнутраны попыт будзе аслаблены, інфраструктура ў існуючым выглядзе не будзе запатрабаваная і пачне разбурацца. Такім чынам, гэта гаснучая эканоміка. Пры такой сітуацыі правільнай стратэгіяй з'яўляецца не новыя капіталаўкладанні, а выманне капіталаў», — растлумачыў Калташоў. Па словах аналітыка, тэндэнцыя заняпаду Клайпедскага порта захаваецца ў найбліжэйшыя дзесяць гадоў.

### РАСЦЯГНУЦЬ НА МЕТАЛАЛОМ

Эксперты кажуць, што транзітныя кантракты заключаюцца на доўгі тэрмін. «Яшчэ год-два Клайпеда будзе функцыянаваць у цяперашнім рэжыме. Але паступова транзіт сыдзе. Партовыя магутнасці стануць непатрэбныя, порт расцягнуць на металалом», — спрагназаваў сітуацыю iz.ru кіраўнік Цэнтра беларускіх даследаванняў Інстытута Еўропы РАН Мікалай Мяжэвіч.

Ён дадаў, што Літве будуць нанесеныя значныя страты. «Вільнюс, мабыць, не пралічвае наступстваў. Інакш бы не праводзіў такую самагубную палітыку. Верагодна, грошай на ўласнае выжыванне ў партый і элітаў хопіць, а пра грамадзян улады не думаюць. У рэшце рэшт, за гады незалежнасці з рэспублікі выехала траціна насельніцтва. Нікога не турбуе, калі з'едзе яшчэ траціна», — адзначыў Мікалай Мяжэвіч.

Намеснік дырэктара Інстытута гісторыі і палітыкі МПДУ Уладзімір Шапавалаў заўважыў, што «калі расійскі і беларускі транзіт сыдуць з Прыбалтыкі, то інфраструктура прыйдзе ў заняпад. Парты будаваліся ў разліку на велізарны Савецкі Саюз. Цяпер будуць абслугоўваць тры невялікія краіны з малюсенькім унутраным рынкам», — падкрэсліў эксперт. У доўгатэрміновай перспектыве, прагназуе rubaltic.ru, прыбалты з усёй сваёй геаграфічнай прывабнасцю апынуцца на перыферыі грузапатокаў Еўрасаюза.

Экс-кіраўнік МЗС Літвы Павілас Гіліс лічыць, што прычына эканамічнага крызісу ў рэспубліцы крыецца ў «эліце» і носіць сістэмны характар. «Мы жывём ва ўмовах палітычнага, прававога, маральнага і эканамічнага крызісу, і, магчыма, галоўнай яго прычынай з'яўляецца ідыятызм нашай «эліты», — заявіў Гіліс парталу Pozicija.



**Пётр ДУНЬКО.**

Ігуменскі тракт
№ 5 (270)



Храмы маёй радзімы

**Свята-Васкрасенскі сабор**

**Касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі**

**Вялікая сінагога**

*г. Барысаў*

# ВАСКРАСЕНСКІ САБОР, ПЕРАБУДАВАНАЯ СІНАГОГА І ЭНЕРГЕТЫКА СТАРЫХ КАМЯНЁЎ

**Калі ты нарадзілася і вырасла ў Барысаве, не заўважыць Свята-Васкрасенскі сабор было проста немагчыма. Храм з чырвонай цэглы з дзевяццю купаламі, арачнымі вокнамі ды званіцай выглядаў для савецкага падлетка як поўны анклаў. Падкрэслена выпадаў са знаёмай рэчаіснасці, панаваў над прасторай, прыцягваў погляд.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

А купалы? Яны бачныя нават з супрацьлеглага берага Бярэзіны. Я часцяком хадзіла цераз мост пехатой. Глядзіш уніз, на раку і карпусы завода «Пралетарскі молат», і думаеш пра тое, што раней Бярэзіна была шырэйшая, хадзілі па ёй параходы і баржы. Над ракой — пад'ёмны мост, улюбёнае месца шпацыраў пані з карункавымі парасонамі. Сабор тады ўжо быў, а званы, мабыць, званілі так, што і ў новым горадзе было чуваць.

Паколькі ў школе казалі, што сабор наведваюць толькі бабулькі альбо зусім адсталыя людзі, пайсці туды вельмі хацелася. Сабор атачала асаблівая атмасфера таямнічасці. Ён быў паглыблены ў сябе, як гук у драўлянае цела скрыпкі. Жыў паралельным жыццём, як кніга Марыны Цвятаевай, якую мне неахвотна прыносілі з фонду бібліятэкі, папярэдне пасадзіўшы мяне за асобны столік. Памятаю, як заняло дух, калі прачытала: «Бог, не суди! — Ты не был женщиной на земле!». Богу — як роўная! «Лепш на вось, пачытай», — бібліятэкарка ўручала мне кніжку Міхаіла Герчыка «Ветер рвет паутину».

Мяжа ў паралельны свет ахоўвалася. У бібліятэцы — бібліятэкарам. У школе — настаўнікамі. Каля сабора — цётачкамі-актывісткамі, якія ў рэлігійныя святы дзяжурылі там, пільна высочваючы сярод людзей, што ішлі ў храм, піянераў і камсамольцаў. Фактычна ўсё, не прадпісанае школай непасрэдна, для савецкага падлетка было звязана з пераадоленнем межаў. Трэба сказаць, рабіць гэта мы навучыліся выдатна. Дома ў многіх з нас ляжалі часопісы з чырвонымі профілямі заснавальнікаў марксізму-ленінізму на вокладках, на паліцах сталі антырэлігійныя кнігі. Але мы ведалі, як іх правільна чытаць. Калі я была ва ўзросце дваццаці двух гадоў мне ўпершыню трапіла ў рукі сапраўдная Біблія, і я тады здзівілася, як шмат даведалася з «Забаўнага Евангелля» Леа Таксіля, інтэрпрэтуючы здзеклівы тон гэтага тэксту роўна наадварот.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Тое ж датычылася і сабора — урэшце, любой канфесійнай установы. У іх не пускалі, бэсцілі і высмейвалі, — значыцца, варта было туды схадзіць. Я жыла ў новай частцы Барысава, але часта бывала ў цэнтры старога горада на рынкавай плошчы — гэтаму месцу не адно стагоддзе. Наведвала і Дом піянераў, ён знаходзіўся непадалёк, на вуліцы III Інтэрнацыянала. Ужо дарослай даведалася: у гэтым будынку да 1917 года была Вялікая сінагога Барысава. У 60-я гады будынак рэканструявалі, зрабілі двухпавярховым. На старых фотаздымках яго не пазнаць: з высокімі арачнымі вокнамі і вітражом на фасадзе, сінагога відавочна не ўпісвалася ў прасталінейную кубічную архітэктуру месца. Яшчэ менш яна ўпісвалася ў прасталінейную атэістычную ідэалогію. Як і Касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі, што месціўся непадалёк, на той жа вуліцы III Інтэрнацыянала.

Ну і, вядома, мне даводзілася бываць у кінатэатры «Перамога» — тыпавая каробка гэтай установы культуры стаяла побач з Васкрасенскім саборам. Толькі што скончыліся сямідзясятыя, у кінатэатрах паказвалі фільм «У маёй смерці прашу вінаваціць Клаву К.», нас павялі на яго ўсім класам. Некаторыя дзяўчаткі адразу ж захацелі стаць сцярвознымі прыгажунямі, бо менавіта з-за Клавы, а не з-за добрай і працавітай Тані, хоча памерці Сярожа. Цяжка сказаць, ці разумелі арганізатары гэтых калектыўных праглядаў, наколькі амбівалентным месэдж укладаўся ў галовы нашых выдатніц, якім штодня паўтаралі, як важна вучыцца, вучыцца, вучыцца, а з кінастужкі вынікала: дастаткова быць прыгожай, і тады знойдзецца ён, разумны і таленавіты, і зробіць за цябе кантрольную. І наогул усё зробіць, а ад цябе патрабуецца толькі загадкава ўсміхацца, як Клава.

У сабор я ўпершыню ўвайшла якраз пасля прагляду нейкага савецкага фільма ў кінатэатры «Перамога». У паўзмроку гарэлі свечкі, людзей амаль не было, ніхто не збіраўся зацягваць мяне ў страшную секту, як Сашу Шчарбініна з кніжкі пра павуціне ды вецер. Ціхая жанчына ў кутку прадавала свечкі і папяровыя абразкі. Я разглядзела абразы і фрэскі, дакранулася да сцяны — нібыта адчула дзіўнае цяпло. Святар айцец Андрэй Капульцэвіч, які аднаўляў разбураны Свята-Міхайлаўскі храм у Зембіне, растлумачыў мне ў пачатку лета 2012 года, што камяні старажытнай царкоўнай сцяны «намоленыя», таму пры рэканструкцыі іх не выкідваюць, а хаваюць у зямлі, у межах царкоўнай агароджы. Шкада, я не ведала пра гэта ў дзяцінстве, бо паспрабавала б адчуць і выпраменьванне камянёў старой сінагогі, ператворанай у Дом піянераў.

Дарэчы, найбольшы ўрон Зембінскай Свята-Міхайлаўскай царкве нанеслі акурат падчас здымак адной вядомай кіно: кінастудыя «Таджыкфільм» у сярэдзіне шасцідзясятых здымала тут эпізоды мастацкага фільма «Перапёлачка». Паводле сцэнарыя, савецкі танк павінен быў на поўным хаду протараніць сцяну храма, аднак моцны мур не паддаўся, тады сцяну ўзарвалі, а потым заклалі прыём, каб зняць эпізод з Т-34. Ролю танкіста ў фільме выканаў Мікіта Міхалкоў, тады яшчэ малады акцёр. Айцец Андрэй паказаў мне месца, дзе знаходзілася ўзарваная алтарная сцяна, і тэрыторыю за храмам, дзе былі калісьці старадаўнія могілкі. Паказаў і рэліквіі, якія мясцовыя жыхары ўратавалі пры разбурэнні храма, хавалі доўгі час, а цяпер вярнулі ў аднаўленую царкву: стагадовыя абразы, рызы з медзі старадаўняй чаканкі. Ну, і сведчанні візітаў атэістычных «паломнікаў» я там пабачыла, а як жа: на сцяне неадрэстаўраванай яшчэ часткі храма значылася: «Тут был Вова. 1971 год».



А мне ў сямідзясятыя падарылі фотаапарат. Што ў Барысаве магло быць вартае ўвасаблення? Батарэі, гарматы каля музея, Бярэзіна, Васкрасенскі сабор... Я зрабіла мноства фота і адправіла дзяўчынцы з ГДР, тады многія з нас ліставаліся са школьнікамі з сацыялістычных краін. З сяброўкай мы праяўлялі плёнкі, друкавалі і сушылі фатаграфіі, раскладваючы іх на старых газетах. Пасля гэтага ўвесь дом, як восеньскі парк лісцем, быў засыпаны чорна-белымі краявідамі.

Я не толькі фатаграфавала віды горада, але і пісала вершы. Аднойчы іх апублікавалі ў раённай газеце. І праз некаторы час я адправілася на вуліцу Марозава, дзе жыў паэт Леанід Рашкоўскі, зусім блізка ад сабора. Хвалявалася, бо ўпершыню збіралася паказаць сваю творчасць паэту, які меў не адну кніжку і быў сябрам Саюза пісьменнікаў СССР. Паэт чакаў мяне ў інвалідным вазку, ён меў хваробу, праз якую не мог хадзіць. Вершы Рашкоўскаму спадабаліся, назад я ішла шчаслівая. Калі праходзіла паўз рынкавую плошчу, села на лаву каля сабора, бо не цярпелася пагартаць кнігі з бібліятэкі паэта, якія ён даў мне пачытаць.

У адным з будынкаў, што выходзяць на плошчу, якая цяпер носіць назву ў гонар 900-годдзя Барысава, знаходзілася майстэрня мастака Міколы Рыжага, які маляваў партрэты знакамітых беларусаў, паштовыя маркі з выявамі Францыска Скарыны, Кастуся Каліноўскага, Тадэвуша Касцюшкі, Міхала Клеафаса Агінскага, Янкі Купалы, Якуба Коласа, а таксама экслібрысы. На адным з тых экслібрысаў — купалы Васкрасенскага сабора, на іншым — герб Барысава, які ўяўляе сабой гарадскую браму з дзвюма вежамі і выявай Святога Пятра над імі: герб горада амаль не змяніўся з часоў ВКЛ. Мікола Рыжы аформіў шмат беларускіх кніг. Зрабіў ён вокладку і для першай маёй кніжкі, у якую ўвайшлі тыя самыя юнацкія вершы, напісаныя пад уплывам энергетыкі старых камянёў Барысава, тых месцаў, дзе стагоддзямі жылі мае землякі, марылі, маліліся, спадзяваліся на лепшае жыццё і набліжалі яго, як умелі.

У апошнюю дакаранавірусную восень мне давялося пабываць у нямецкім Бамбергу, убачыць кафедральны сабор Святога Пятра і Святога Георгія. Сабору ўжо больш за тысячу гадоў. Пахмурнае лістападаўскае неба вельмі пасавала да гэтай строгай прыгажосці. А мармуровы анёл на фасадзе сабора Нуэстра Сеньёра дэ ла Асунсьён, што ў Санцьяга-дэ-Куба, на фоне аквамарынавага неба і вечнага сонца здаваўся мне поўным радасці і жыццялюбства, як і самі тамтэйшыя жыхары. Сабор у Санцьяга, дарэчы, таксама мае немалы ўзрост — каля пяцісот гадоў, яго нязменна адбудоўвалі пасля набегаў піратаў, пажараў, землятрусаў. Гледзячы на веліч і прыгажосць канфесійных устаноў у іншых краінах, я згадваю родны Барысаў, яго цэрквы, сінагогі ды іншыя гістарычныя помнікі, не ўсе з якіх захаваныя для нашчадкаў.

**Алена БРАВА.**

Прывіды беларускіх муроў



Герб Любчы.

# АХОЎНІК ЗРУЙНАВАНАГА ЗАМКА

## Чаму ваявода берасцейскі б'е гультаяватых будаўнікоў па патыліцы?

Які ж прыстойны замак без зданяў...

Тым больш калі ягоаднаўляюць, укладваючы душу, — хіба не адшкадаваць прыгожых ды страшных легендаў?

Любчанскі замак, што стаіць на пакручастым беразе Нёмана, паўстае зноў ва ўсёй красе намаганнямі валанцёраў. Тут вам распавядуць мясцічныя гісторыі — і пра цмока, які ахоўваў гэтыя мясціны, але быў забіты чужынцамі, пра князя Міндоўга, які сустрэў каля ракі злавесную прыгажуню Марту, закахаўся, таму і назвалі мястэчка — Любч, Любеч. Пра дарожку з зялёных агнёў, што паказвае месца да скарбу. Ну, і пра прывід былога ўладальніка, які пільна сочыць за работай па аднаўленні замка. Як што не так зробіш — атрымаеш нябачнай рукой па патыліцы.

А пра беларускіх цмокаў толькі лянівы не чуў... І ў Свіслачы яны вадзіліся, і ў пячоры Высокай гары ў Мінску, і ў Лепелі, і ў возеры Нешчарда вадзяныя цмокі жылі... Паслухаць легенды, дык ледзь не ў кожнай вёсцы які-небудзь чарнакніжнік выводзіў цмока з яйка чорнага пеўня, панасіўшы тое пад пахай... Пра агні, што пазначаюць месца скарбаў, таксама паданняў хапае. А вось што датычыцца прывіда-ахоўніка... Ён асаблівы. Лічыцца, што гэты «нябачны прараб» — Ян Кішка, ваявода берасцейскі, пры якім замак і будаваўся.

### ЯН З «ЗАЛАТОЙ МОЛАДЗІ»

Як мы з вамі ўжо ведаем, для з'яўлення прывіда трэба падстава: ці не завершаная персанажам справа, ці пасля ягонай смерці здарылася штосьці такое, што тую асобу пры жыцці моцна абурыла б.

Давайце падумаем, што магло б гэтак моцна раззлаваць пана Яна Кішку?

Па маці ён з Радзівілаў, а бацька быў такі багаты, што пакінуў, як кажуць, спадчынніку семдзесят гарадоў і чатыры сотні вёсак.

Любча была сярод іх... Але радавой сядзібай Кішкаў не лічылася, пераходзячы з рук у рукі. Альбрэхт Гаштольд перадаў горад сыну, Станіславу Гаштольду, які ажаніўся з сястрой Барбары Радзівіл Ганнай. То быў час уладнай каралевы Боны, якой прыпісвалі смерці шмат якіх магнатаў, што пераходзілі ёй дарогу... Прынамсі, і Альбрэхт Гаштольд тады неяк дзіўна хутка памёр, а за ім і малады Станіслаў, не пакінуўшы спадчыннікаў. Любча на нейкі час адышла дзяржаве, чытай — Боне, потым апекаваўся Любчай канцлер Павел Сапега... Пазней уладаром тут за свае заслугі стаў Станіслаў Кішка, вялікі гетман літоўскі.

Так што ягоны сын Ян Кішка быў з так званай залатой моладзі, атрымаў бліскучую адукацыю ў Еўропе... А адпраўлены быў у дзесяцігадовым узросце спачатку ў Швейцарыю, у Базель, у кальвінісцкую школу — таму што ў ягонага бацькі ў Віцебску важную вайсковую пасаду займаў швейцарац, які і павёз багатага недарostка адукоўвацца.



Крыштоф Радзівіл, які жаніўся на пляменніцы Яна Кішкі, вярнуў у Любчу кальвіністаў.

Потым Ян вучыўся па іншых гарадах... Цюрых, Рым, Неапаль, Балонья... Час еўрапейскага Адраджэння, час Рэфармацыі. З падарожжа Ян Кішка вярнуўся прыхільнікам пратэстантызму. А калі ў сямнаццаць гадоў атрымаў пасаду крайчага вялікага літоўскага, а ў васямнаццаць гадоў узначаліў атрад з 400 панцырных гусараў ды 120 італьянскіх алебардыстаў — увогуле магутнай персонай сябе адчуў... Ён удзельнічае ў паходзе Стафана Баторыя на Маскоўю. Хоць кароль быў заціяты каталік, ён вымушаны быў лічыцца з магнатамі розных канфесій... Дарэчы, ажаніўся Ян Кішка з дачкой праваслаўнага князя-асветніка Канстанціна Астрожскага, ваяводы кіеўскага.

### АРЫЯНСКАЕ ГНЯЗДО І ВЕЖАВЫ ГАДЗІННІК

Ян у сваіх маёнтках пачынае апантана падтрымліваць арыянства — адну з пратэстанцкіх плыняў, асуджаную як ерась яшчэ на Нікейскім саборы. На беларускіх землях у арыян было нямала вядомых прыхільнікаў, згадаць таго ж Сымона Буднага. Кішка мае вялікія планы, замяняе кальвінісцкіх пастыраў арыянскімі, будуе ў Любчы вялікі арыянскі збор, засноўвае тэалагічную школу. З'яўляюцца каменныя будынкі брацтва, школы, шпіталя. У 1582-м у Любчы нават адбыўся арыянскі Сінод. Дарэчы, і сам Ян напісаў некалькі тэалагічных трактатаў і ў тэалагічных спрэчках удзельнічаў: ён быў супраць радыкалаў у арыянскім руху. А ў гісторыі застаўся яшчэ і дзякуючы свайму выступленню на сойме 1589 года ў абароны верацярпімасці.

З'явіўся ў Любчы і будынак ратушы. Бо Ян у 1590-м дамагаецца ў Жыгімонта Вазы Магдэбургскага права для Любчы, якая займела герб: «у блакітным полі срэбная падкова з трыма залатымі крыжамі і дзвюма срэбнымі рыбамі». Прычым падкова са срэбнымі крыжамі ўзятая з герба самога Кішкі «Дуброва».

І, вядома, упрыгожвае мястэчка замак — згодна са знойдзеным флюгерам, датай ягонага нараджэння (а мо пачаткам будаўніцтва?) называюць 1581 год. На беразе Нёмана быў насыпаны вялізны пагорак, пачалі падымацца муры... Слынны гісторык Міхась Ткачоў датаваў пачатак будаўніцтва сярэдзінай шаснаццатага стагоддзя, арыентуючыся на гатычна-рэнесансны тып кладкі. Так што, хутчэй за ўсё, пры Яну Кішку на месцы замка ўжо нешта было. Замчышча абвалі ровам шырынёй да 30 метраў і глыбінёй ад 7 да 10 метраў, з чацвёртага боку замак ахоўваў Нёман. Як сцвярджаў Міхась Ткачоў у кнізе «Замкі і людзі», меліся дзве магутныя вежы. Адна з іх, мураваная — замак быў спачатку часткова драўляны, — мела чатыры ярусы бою, з байніцамі ружэйнымі ды гарматнымі. Вежу аздабляў нават гадзіннік — раскоша для XVI стагоддзя.

### СКАНДАЛЬНЫ ШЛЮБ УДАВЫ

Ян Кішка памёр даволі, на наш сучасны пагляд, рана — у сорак гадоў, на зыходзе «залатога», XVI стагоддзя, 7 ліпеня 1592 года. Пакінуў запавет: у ягоных уладаннях павінна падтрымлівацца арыянства.

А вось нашчадка гетман не пакінуў. Сустракала там-сям згадкі пра дачку Ганну, але факт, што сына не было. Альжбета Астрожская засталася ўдавой з агромністымі ўладаннямі. На якія, вядома, адразу пачалі прэтэндаваць сваякі памерлага. Удава мела права толькі прыжыццёвага карыстання, так што распарадзіцца лёсам спадчыны не магла. Адзіным выйсцем быў новы шлюб.



Замак у Любчы.



Любча.

**«У Яна Кішкі сапраўды ёсць важкія прычыны быць незадаволеным тым, як абышліся з ягонай спадчынай, і прыглядаць за ходам яе аднаўлення. Легенда пра «прывіднага прараба», які сочыць за будаўніцтвам замка і карае за непавагу да яго, мае падставы». Ці верыць у тое — вырашайце самі.**

І вось тут вымалёўваецца вельмі цікавая гісторыя, пра якую я вам ужо трохі апавядала. Апекуном Альжбеты пасля смерці мужа быў прызначаны яе сваяк, муж ейнай сястры-нябожчыцы Кацярыны Крыштоф Радзівіл Пярун. Вось ён да Альжбеты і сватаецца. На той час Пярун быў ужо тройчы ўдавец, з Кацярынай Астрожскай ажаніўся другім шлюбам і займеў ад яе сына Януша.

Крыштоф Радзівіл лічыўся скупечай, а яшчэ і заціятым кальвіністам. Ягонае жаданне займець уладанні Яна Кішкі было, вядома, і чыста матэрыяльным зацікаўленнем, але яшчэ і магчымасцю дабрацца да гнязда блюзнераў-арыян, з якімі кальвініст Пярун ваяваў.

Так што можна вытлумачыць ягоную трывушчасць у вайне за жаданы шлюб. Чацвёрты раз



жаніцца лічылася вялікім грахом, патрабаваўся спецыяльны дазвол духоўных улад. Ні Папа Рымскі, ні праваслаўныя, ні браты-кальвіністы такога дазволу не далі, але Крыштоф Радзівіл павянчаўся.

Даволі высвятляць адносіны з двойчы цесцем, Канстанцінам Астрожскім, дзелячы пасаг Альжбеты. Пасля пэўных саступак Крыштоф Радзівіл нарэшце дабраўся да маёнткаў Яна Кішкі. І зноў парушыў усе правілы: напляваўшы на запавет нябожчыка, выгнаў арыян, пазачыняў іх друкарні, школы і манастыры... Замяняючы ўсё на кальвінісцкія ўстановы.

Так склалася і ў Любчы, якая на доўгі час перайшла ва ўладанне Радзівілаў. Кацярыну Пярун перажыў таксама, яна памерла ў 1599-м. Тады брат Яна Кішкі Станіслаў прэтэндаваў на ўладанне Любчай, але Пярун вырашыў усё хітра: ягоны другі сын Крыштоф, народжаны ад трэцяга шлюбу, з Кацярынай Тэнчынскай, ажаніўся з дачкой Станіслава Кішкі Ганнай.

Крыштоф таксама быў заціятым кальвіністам, і першае, што ён зрабіў у Любчы, — пераасвяціў арыянскі кляштар у кальвінісцкі.

Ягоны сын Януш захоча зрабіць Любчу рэзідэнцыяй для сваёй другой жонкі, дачкі малдаўскага гаспадара Марыі Лупу, запросіць італьянскіх архітэктараў, замовіць французскіх габеленаў і італьянскай мэблі на фантастычную суму, зладзіць тэатр — ажно дзве трупы...

Пра колішняга ўладара, ваяводу берасцейскага і ягоныя памкненні ніхто і не ўспомніць.

Тым больш ужо ў наш час, пакуль не ўзяліся за справу энтузіясты з фонду «Любчанскі замак», ад замка заставаліся падмуркі...

Так што ў Яна Кішкі сапраўды ёсць важкія прычыны быць незадаволеным тым, як абышліся з ягонай спадчынай, і прыглядаць за ходам яе аднаўлення. Легенда пра «прывіднага прараба», які сочыць за будаўніцтвам замка і карае за непавагу да яго, мае падставы.

Ці верыць у тое — вырашайце самі.

Але ў любым выпадку абавязкова наведайце чароўны Любчанскі замак, які стаіць на высокім беразе Нёмана, а пры магчымасці — дапамажыце тым, хто яго ўзняў.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в аренду в г. Осиповичи Могилевской обл.

| № лота | Наименование объекта / адрес участника | Кадастровый номер, срок аренды | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. документации, проведение оценки (руб.) | Описание не завершенного строительством жилого дома, дачи, его составных частей. Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании | Условия развития инженерной инфраструктуры застраиваемой территории |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом по ул. Береговой, 2г в г. Осиповичи, (площадь застройки 157 м², готовность 11 %) и земельный участок | 724850100002001903, срок аренды – 99 лет | 0,1202 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 3 127,16, в том числе начальная цена не завершенного строительством законсервированного жилого дома – 1 203,96 руб., начальная цена права заключения договора аренды земельного участка – 1 923,2 руб. | 600,00 | 136,99 | Незаконсервированный жилой дом: фундамент – бетонный, износ конструктивных элементов – 80 %, площадь застройки – 157 м² | Транспортная инфраструктура |
| Размер штрафа, уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 марта 2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 | | | | | | | | | 2700,00 рублей |

**Организатор аукционных торгов – УКПП «Архитектура» Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. Сумченко, 33.**

Контактные телефоны: +3752235-66101, +375293999800, +375336075847.

Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется Осиповичскому районному исполнительному комитету на р/с № BY89AKBB36411165100057100000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 722, BIC AKBBBY2X, УНП 700023235. Задаток перечисляется в период подачи заявлений до момента регистрации участника.

**Условия проведения аукциона:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 марта 2018 г. № 220, и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, лица без гражданства, индивидуальные предприниматели и юридические лица.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона до его начала:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка; гражданином – копия документа, содержащая его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения), за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством законсервированный одноквартирный жилой дом;

- возместить расходы, понесенные бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

Информация о данных затратах, доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается на расчетный счет, указанный в протоколе о результатах аукциона, либо о признании аукциона не состоявшимся;

• не позднее двух рабочих дней после внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения), возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, заключить договор аренды земельного участка с Осиповичским районным исполнительным комитетом;

• в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка в установленном порядке обратиться за государственной регистрацией прав на земельный участок, ограничений (обременений) прав на него в организацию по государственной регистрации (г. Осиповичи, ул. Ленинская, 86);

• соблюдать права и обязанности землевладельцев, землепользователей и собственников земельных участков, установленные Кодексом Республики Беларусь о земле;

• осуществлять всякое строительство, расширение, реконструкцию строений и сооружений в соответствии с законодательством.

**Аукцион состоится 26 марта 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Осиповичи, ул. Сумченко, 30, каб. № 29.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 23.02.2021 г. до 16.30. 24.03.2021 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Осиповичи, ул. Сумченко 33, каб. 304. Контактные телефоны: (+372235) 66101, +375293999800, +375336075847.**

**Сайты: www.osipovichi.gov.by, www.mogilev-region.gov.by и www gki.gov.by**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский рыбокомплекс» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Журова С. В. извещает о проведении 25 марта 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условия продажи:** 1) Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2) Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. 3) Лоты расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000002000638 площадью 2,0237 га, предоставлен ОАО «Гомельский рыбокомплекс» на праве постоянного пользования. После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий направленных на выделение и регистрацию земельных участков,** необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на покупателя. В связи с обеспечением возможности для каждого из образованных в результате раздела (выделения, деления) земельных участков беспрепятственных подъездов (подходов) для организации доступа к ним с целью содержания и обслуживания покупателями приобретенных зданий и сооружений в соответствии со ст. 268 ГК Республики Беларусь, ст. ст. 19, 45 Кодекса Республики Беларусь о земле установить право ограниченного пользования чужим недвижимым имуществом (сервитут) на объекты недвижимости (земельные участки), через которые покупатели каждого из выставляемых на аукцион лотов после их приобретения имели бы доступ к ним с целью содержания и обслуживания приобретенных зданий и сооружений. 4) В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 % | | | | |
| **Местонахождение лотов №№ 1–10:** Гомельская обл., Гомельский р-н, г. Гомель, ул. Шилова, д. 16 | | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-51855** общей площадью 201,1 кв. м, назначение – здание административное, наименование – одноэтажное кирпичное административное здание. Здание административно-хозяйственное с холодной пристройкой (инв. № 0003). Ворота (инв. № 1001). Дверь металлическая (инв. № 3202). Компьютер (ПЭВМ CDL-pro. Монитор BenQ) (инв. № 3190). Компьютер «ЛОГОС» (комплект) (инв. № 3331). Компьютер «ЛОГОС» (комплект) (инв. № 3332). Компьютер «ЛОГОС» (комплект) (инв. № 3333). Компьютер «ЛОГОС» (комплект) (инв. № 3334). Компьютерный комплекс (инв. № 3453). Компьютерный комплекс (инв. № 3252). Компьютерный комплекс (инв. № 3251). Компьютерный комплекс (инв. № 3250). Кондиционер Windair WRH-091NBE (инв. № 3449). Кондиционер Windair WRH-091NBE (инв. № 3448). Кондиционер Hyundai HSH-S241 NBE (инв. № 3450). Кондиционер Ballu BSR-0,9 H (инв. № 3330). Копировально-множительный аппарат XEROX WC PE-16E (инв. № 3149). Копировальный аппарат AR-5316 (инв. № 3253). Печь муфельная учебная ПМ-10-01 (инв. № 3216). Погруз. тележка (инв. № 3259). Принтер TSP TTP 244 термотрансферный (инв. № 3335). Принтер HP Laserjet 1100 (инв. № 3049). Принтер HP Laserjet 1100 (инв. № 3052). Регулятор расхода ПВС АРТ-01.01 (инв. № 3208). Сигнализация (административное здание) (инв. № 3305). Сигнализация (магазин) (инв. № 3326). Сигнализация (склад) (инв. № 3303). Счетчик денег Magner 35DS (инв. № 3065). Тел./факс Panasonic KXFT 31 RS (инв. № 3061). Тел./факс «Панасоник» (инв. № 3093). Термотуннель ТПЦ-550Р (инв. № 3178). Упаковщик TW-450 (инв. № 3342). Факсимильный аппарат KX-FT934RU (инв. № 3254). Факсимильный аппарат KX-FT934RU (инв. № 3255). Фасовочно-упаковочная линия (инв. № 3195). Шкаф учета (инв. № 3323). Шкаф холодильный ШХ-0,7 ДС (н) (инв. № 3313). Шкаф ШСС-200 (стерилизатор) (инв. № 3181). Мебель кухонная (инв. № 3440). Мебель обеденная (инв. № 3441). Шлифмашина углов. BOSCH GWS 22-230H (инв. № 3343). Дорожный знак (610*1730) на одной метал. стойке (инв. № 3452) | **148 590,06** | 7 429,50 | 14 859,01 |
| 2 | ТУ (теплоузел 11, инв. № 0023). Ворота металлические с ограждением (инв. № 1000). Ограждение (забор кирпичный инв. № 1002). Проезжая часть (асфальтовое покрытие, инв. № 1008). | **953 800,00** | 47 690,00 | 95 380,00 |
| 3 | Склад ГСМ (инв. № 0025). Склад (инв. № 0024). Трансформаторная подстанция (ТТП) (инв. № 0026). Склад (инв. № 0027). Склад (инв. № 0035). Эстакада (инв. № 0037) | **69 900,00** | 3 495,00 | 6 990,00 |
| 4 | Склад (инв. № 0032). Склад (инв. № 0031). Склад (инв. № 0030). Склад (инв. № 0028). Навес (инв. № 0033). Навес (инв. № 0029) | **251 400,00** | 12 570,00 | 25 140,00 |
| 5 | Гараж (инв. № 0036) | **4 600,00** | 230,00 | 460,00 |
| 6 | **Капитальное строение (инв. № 0005)** общей площадью 12,8 кв. м, наименование – здание проходной | **2 100,00** | 105,00 | 210,00 |
